ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ПАНЯДЗЕЛАК, 17 КАСТРЫЧНІКА 1938 г. № 57 (399)

ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

ЭКІПАЖУ САМАЛЁТА „РОДИНА" ГРЫЗАДУБАВАЙ, ОСІПЕНКА І РАСКОВАЙ

Цэнтральны Камітэт Комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі горача вітае і віншуе вас — слаўных дочак соцыялістычнай радзімы — з паспяховым скачэннем рэкорднага для жанчын пералёту на дальнасць па маршруту Масква—Далёкі Усход.

Ваша адвага, хладнакроўе, большэвіцкая вытрымка яшчэ раз прадэманстравалі перад усім светам гераізм совецкіх жанчын, выхаваных партыяй Леніна—Сталіна.

Совецкая Беларусь захоплена вашым гераізмам і высокім лётным майстэрствам, якія дазволілі вам у найцяжэйшых умовах зрабіць пасадку самалёта.

Вы, совецкія жанчыны, яшчэ раз паказалі ўсяму свету, якія неабмежаваныя магчымасці мае наша краіна, якія невычарпальныя рэзервы хаваюцца ў народных крыніцах нашай любімай радзімы, якіх велізарных перамог дасягнула краіна соцыялізма пад кіраўніцтвам вялікай партыі Леніна—Сталіна.

Сакратар ЦК КП(б)Б Н. ГРЭКАВА.

ДРУК—МАГУТНАЯ ЗБРОЯ ПРАПАГАНДЫ

Глыбокае вывучэнне гісторыі Усесаюзнай комуністычнай партыі (большэвікоў) адыграе велізарнейшую ролю ў палітычным выхаванні нашых кадраў. Авалоданне перадавой рэволюцыйнай тэорыяй павысіць боездольнасць большэвікоў, партыйных і непартыйных, дасць ім неабходную палітычную загартоўку, сілу арыентыроўкі, яснасць перспектывы, упэўненасць у рабоце.

Трэба зрабіць усё гэта для таго, каб узняць прапаганду марксізма-ленінізма на належную тэарэтычную вышыню, каб раскрыць усё багацце ідэй, што выкладзены ў Гісторыі ВКП(б). Зусім відавочна, што прапаганда марксізма-ленінізма пойдзе паспяхова толькі пры ўмове рашучага ўстаранення бюракратычных скажэнняў у арганізацыі прапагандысцкай работы, якія мелі месца дагэтуль і тармазілі палітычны рост нашых кадраў.

Так ужо павялося, напрыклад, што, калі партыйнага работніка пытаюць аб партыйнай асвеце, аб пастаноўцы партыйнай прапаганды, то неадкладна выцягваецца статыстычная зводка аб колькасці гурткоў, аб колькасці комуністаў, «ахопленых» гэтымі гурткамі. На першым месцы стаіць статыстыка, цыфір, а не жывы чалавек з яго запатрабаваннямі, пажаданнямі, здольнасцямі. Свае намаганні ў галіне прапаганды партыйныя арганізацыі накіроўвалі галоўным чынам у бок колькаснага расшырэння гурткоў, не клапоцячыся аб **якасці** прапаганды, аб змесце прапагандысцкай работы. Такі бюракратычны падыход да прапаганды парадзіў шкалярства, несур'ёзнае, павярхоўнае вывучэнне прадмета. Цікавая, захапляючая справа рабілася нейкай павіннасцю для комуністаў.

Жаданне працаваць па-старынцы, не ўдумваючыся ў сутнасць задачы, выявілася і ў тым, што, калі была апублікавана Гісторыя ВКП(б), многія партыйныя арганізацыі перш за ўсё паставілі пытанне аб расшырэнні сеткі гурткоў, аб павелічэнні «ахопу», словам, захапіліся фармальнай статыстыкай. Уся ўвага была накіравана ў адзін бок: арганізаваць вусную прапаганду. І недаравальна забылі аб другім, больш важным, баку справы: аб **друкаванай прапагандзе**, роля якой у нашай краіне выключна вялікая.

Наша партыя заўсёды прыдавала друку велізарнае значэнне. Усім вядома славутае ленінскае вызначэнне друку. Друк, па выражэнню В. І. Леніна, гэта калектыўны прапагандыст, калектыўны агітатар, калектыўны арганізатар. Праз друк наша партыя штодня гаворыць з масамі, выхоўвае іх у соцыялістычным духу, абучае майстэрству рэволюцыйнай барацьбы. «Друк, — вучыць нас таварыш Сталін, — павінен расці не па днях, а па гадзінах, гэта — самая вострая і самая моцная зброя нашай партыі». У нашай краіне гаспадаром друку, гаспадаром усіх газет, друкарняў, выдавецтваў, бібліятэк з'яўляецца народ. Друк служыць свайму народу, сваёй партыі, у яго, як і ў народа, адны мэты, адны задачы. Большэвіцкае друкаванае слова карыстаецца заслужаным аўтарытэтам сярод працоўных, бо наш друк заўсёды служыў інтарэсам працоўных мас. Ці трэба даказваць, якой гіганцкай сілай уладае друкаваная прапаганда, якое месца яна можа і павінна заняць у пашырэнні ідэй марксізма-ленінізма!

Аднак да гэтага часу існуе разрыў паміж вуснай і друкаванай прапагандай. Друк, па сутнасці справы, стаіць у баку ад прапаганды марксісцка-ленінскай тэорыі. Прапаганда вядзецца амаль выключна ў гуртках, г. зн. вусна. Слухачы прыходзяць на заняткі гуртка, прапагандыст расказвае, задае пытанні слухачам, робіць заключэнне па тэме, і заняткі лічацца праведзенымі. Ці задавальвае запатрабаванні комуністаў такая форма палітычнай асветы. Не, далёка не задавальвае. Гурткі, як **галоўная** форма большэвіцкай прапаганды, былі ўмесны ў дарэволюцыйныя годы, калі наша партыя была ў падполлі, калі партыя была на нелегальным становішчы, калі не было неабходных кніг, калі друк знаходзіўся ў руках капіталістаў. Аставацца зараз на пазіцыях толькі вуснай прапаганды або нават яшчэ вужэй — прапаганды толькі ў гуртках — значыць дапускаць саматужніцтва, значыць трымаць пад спудам такую сілу, як друк, значыць звужваць нашы магчымасці.

Друкаваная прапаганда — самая сучасная форма прапаганды, ёй, безумоўна, павінна належаць камандная роля, на яе баку, знаходзяцца ўсе перавагі. Яна развівае ў чытача цікавасць да тэмы, прывучае да самастойнай, без дробязнай апекі, працы, дае магчымасць пазнаёміцца з першакрыніцамі, наштурхоўвае на пытанні чытачоў, расшырае палітычны кругазор. У чалавека, які самастойна працуе над кнігай, расце вера ў свае здольнасці, ён іншымі вачмі пачынае глядзець на самога сябе. Аб гэтым сёння са старонак нашай газеты красамоўна расказвае маскоўскі прапагандыст тав. Назараў. Сістэматычнае чытанне выклікае патрэбнасць у абмене думкамі з таварышамі, нараджаюцца пытанні, розум робіцца больш дапытлівым, веды западаюць глыбока і надоўга. Прапаганда марксізма-ленінізма праз друк — вялікая і сур'ёзная, агульнапартыйная справа, якую трэба правільна арганізаваць. Публікацыя тэарэтычных артыкулаў, лекцый, кансультацый, адказаў на пытанні чытачоў — усё гэта рушыць наперад справу палітычнага выхавання нашых кіруючых кадраў, самых шырокіх слаёў совецкай інтэлігенцыі.

Друкаваная прапаганда дазволіць таксама выявіць усе лепшыя прапагандысцкія сілы нашай партыі, чаго не дазваляла зрабіць вусная прапаганда. Дапусцім, што ў якой-небудзь партыйнай арганізацыі ёсць выдатны прапагандыст, які таленавіта вядзе заняткі ў сваім гуртку. Слухачы гэтага гуртка надзвычайна задаволены такім кіраўніком, цэняць яго. Але пры ўсіх гэтых якасцях карысць ад такога прапагандыста атрымліваюць толькі 20—30 чалавек, што займаюцца пад яго кіраўніцтвам. Зусім іншы рэзультат атрымаецца, калі лекцыю гэтага таленавітага прапагандыста надрукаваць у журнале, або ў газеце. З ёю знаёмяцца ўжо не 20—30 чалавек, а **тысячы**, дзесяткі і сотні тысяч. Тое-ж самае можна сказаць і аб кансультацыйнай рабоце. І ў гуртках, і ў парткабінетах ёсць нямала прапагандыстаў, якія вельмі добра адказваюць на пытанні слухачоў, вельмі ўмела даюць неабходную кансультацыю. Чаму-ж не публікаваць у друку такія кансультацыі, такія добрыя адказы на пытанні слухачоў? Да прапаганды далучыліся-б не дзесяткі, а тысячы людзей. Вось у чым сіла і значэнне друкаванай прапаганды!

Недапушчальны разрыў паміж вуснай і друкаванай прапагандай пара ліквідаваць. Недарэчна і дзіка адмаўляцца ад друкаванай прапаганды, калі ў нашых руках газеты, журналы, кнігі. Недарэчна механічна пераносіць у нашы ўмовы застарэлыя формы прапаганды, пашыраныя па неабходнасці ў дарэволюцыйны перыяд. Пара пакончыць са шкалярствам, з пагоняй за «ахопам» усіх і ўсякіх гурткамі. Гурткі патрэбны, але ў куды меншым ліку, чым да гэтага часу. Гурткі не толькі не адзіная, але і **не галоўная** форма прапаганды марксізма-ленінізма. Гісторыя ВКП(б) звернута да нашай інтэлігенцыі, да нашых кадраў, якія ўмеюць працаваць самастойна, з алоўкам у руках. Друк павінен стаць, і ён абавязкова стане, усесаюзнай трыбунай прапаганды марксізма-ленінізма.

Вялікія і складаныя задачы паўстаюць перад работнікамі друку. Не сакрэт, што да гэтага часу друк дрэнна займаўся прапагандысцкай дзейнасцю. Артыкул на тэарэтычную тэму—з'явішча даволі рэдкае ў многіх нашых газетах і журналах. У работнікаў друку адсутнічаў густ да пытанняў тэорыі, газеты не цікавіліся зместам прапаганды і таксама гналіся за «ахопам», не пастараўшыся ўвайсці ў сутнасць справы. Велізарнае ўмацненне значэння друкаванай прапаганды патрабуе сур'ёзнай перабудовы нашага друку. Самае галоўнае — згуртаваць вакол газет, вакол журналаў лепшыя прапагандысцкія сілы, стварыць пастаянны аўтарскі актыў, кваліфікавана, сур'ёзна асвятляць пытанні марксісцка-ленінскай тэорыі. Друк будзе трымаць сур'ёзны экзамен перад партыяй, і ён яго абавязан вытрымаць з гонарам.

Стварэнне Гісторыі Усесаюзнай комуністычнай партыі (большэвікоў) адкрыла новую паласу ў тэарэтычнай падрыхтоўцы, загартаванні ўсіх нашых кадраў. Кадры большэвікоў партыйных і непартыйных прыступяць да глыбокага вывучэння марксізма-ленінізма. У гэтай важнейшай палітычнай справе друкаваная прапаганда заклікана адыграць каласальную ролю

(«ПРАВДА», 14-X-1938 г.).

СЛАВА ГЕРАІНЯМ-ЛЕТЧЫЦАМ!


В. ГРЫЗАДУБАВА


П. ОСІПЕНКА


М. РАСКОВА

ПРАЦОЎНЫЯ КОМСАМОЛЬСКА — ТАВАРЫШУ СТАЛІНУ

МАСКВА. КРЭМЛЬ

Таварышу Сталіну

Працоўныя горада Комсамольска, байцы, камандзіры, палітработнікі, сабраўшыся на мітынг сустрэчы з гераічным экіпажам самалёта «Родина»—Валенцінай Грызадубавай, Палінай Осіпенка і Марынай Расковай, шлюць Вам, таварыш Сталін, усімі горача любімаму правадыру, другу і настаўніку, палкае большэвіцкае прывітанне!

Дарагі таварыш Сталін! Сёння ў нас велізарная радасць, нашы сэрцы поўны ўрачыстасці і лікавання. Мы дзелімся з Вамі сваёй радасцю, сустракаючы тых, хто сваім беспрыкладным гераічным пералётам памножыў славу і магутнасць нашай соцыялістычнай радзімы.

Гераізм, адвага, бясстрашша, бязмежная любоў і адданасць сталінскіх пітомцаў нашай вялікай соцыялістычнай радзіме выклікаюць ва ўсіх працоўных Совецкага Саюза законную гордасць і захапленне. Народ, які мае такое слаўнае пакаленне сталінскіх сокалаў,—непераможны.

Такое слаўнае пакаленне верных сыноў і дачок соцыялістычнай радзімы ўзрасціла і выпеставала вялікая партыя Леніна—Сталіна і совецкая ўлада.

Вам, наш родны бацька, настаўнік і друг, абавязаны мы радасным і шчаслівым жыццём. Запэўняем Вас, дарагі таварыш Сталін, што мы, працоўныя горада Комсамольска, байцы, камандзіры і палітработнікі, натхнёныя гераічным пералётам нашых адважных лётчыц—Валенціны Грызадубавай, Паліны Осіпенка і Марыны Расковай, з яшчэ большым энтузіязмам будзем працаваць на карысць радзімы і заўсёды гатовы панесці сакрушальны ўдар фашысцкім падпальшчыкам вайны.

Няхай жывуць нашы гордыя сокалы совецкай авіяцыі!

Няхай жыве вялікая партыя Леніна—Сталіна!

Няхай жыве вялікі Сталін!

(Прынята на агульнагарадскім 30-тысячным мітынгу 12 кастрычніка 1938 г.)

г. Комсамольск-на-Амуры.

МІТЫНГ, ПРЫСВЕЧАНЫ СУСТРЭЧЫ ЭКІПАЖА САМАЛЁТА „РОДИНА"

12 кастрычніка ў 12 гадзін 55 мінут па маскоўскаму часу жыхары Комсамольска-на-Амуры горача сустрэлі слаўных лётчыц тт. Грызадубаву, Осіпенка і Раскову. Ля прыстані, на беразе ракі Амура, сабраліся многатысячныя дэлегацыі працоўных горада з прывітальнымі лозунгамі і партрэтамі гераінь. У суправаджэнні сакратара гаркома партыі г. Комсамольска-на-Амуры тав. Пегава, дэпутата Вярхоўнага Совета РСФСР тав. Качэткова, пілотаў тт. Сахарава і Бурлакова адважныя лётчыцы сышлі на бераг. Экіпажу «Родины» былі прыпаднесены вышытыя партрэты таварышаў Сталіна і Варашылава, кветкі.

У 13 гадзін 30 мінут на плошчы адкрыўся мітынг.

Сакратар гаркома партыі тав. Пегаў павіншаваў слаўных гераінь з бліскучай перамогай.

Ад імя партыйнай арганізацыі і працоўных горада камандзіру экіпажа Валенціне Грызадубавай уручаецца сцяг.

***

Прывітанне Паліны Осіпенка сваім землякам—калгаснікам Бердзянскага раёна

Горача вітаю вас з Далёкага Усхода, з горада юнасці—Комсамольска. Гэта выдатны горад!

Я вельмі шчаслівая, што на маю долю выпала шчасце выканаць сталінскае заданне. Буду працаваць яшчэ лепш, яшчэ больш, не пакладаючы рук, каб узбагачаць нашу прыгожую радзіму.

З прывітаннем

капітан **Паліна Осіпенка.**

Комсамольск-на-Амуры,

15 кастрычніка.

***

БЫВАЙЦЕ, ДАРАГІЯ СЯБРЫ!

Уязджаючы з Комсамольска, гераічны экіпаж самалёта «Родина» звярнуўся да працоўных горада юнацтва з пісьмом, у якім гаворыцца:

«Бывайце, дарагія сябры!

Пакідаючы юны горад Комсамольск, мы яшчэ раз прыносім комсамольчанам гарачую падзяку і сардэчнае дзякуй за дапамогу, аказаную нам, за ўвагу, за сустрэчу — цёплую і душэўную. Комсамольск зрабіў на нас уражанне вялікага горада — прамысловага і культурнага цэнтра Совецкага Далёкага Усхода. Заводы, школы, клубы, кварталы дамоў, створаныя вашымі рукамі, радуюць нас, як радуе ўсякі поспех нашай вялікай справы, справы соцыялістычнага будаўніцтва.

Нам спадабаўся ваш горад, таварышы. Ён стаў за гэтыя дні родным для нас. Комсамольск пабудаваны рукамі адважных комсамольцаў і комсамолак па ініцыятыве таварыша Сталіна, пры штодзённай яго дапамозе. Мы рады, што мелі магчымасць пабываць у гэтым горадзе, кароткая гісторыя якога поўна гераізма і адвагі маладых будаўнікоў. Мы сустракаліся тут з выдатнымі людзьмі, якія працуюць на вашых заводах, будоўлях, ва ўстановах. З такімі людзьмі — палкімі совецкімі патрыётамі — Комсамольск будзе быстра развівацца і далей, памнажаючы сваю магутнасць ва славу любімай соцыялістычнай радзімы.

Любіце свой горад, таварышы комсамольчане! Будуйце новыя заводы, пракладвайце новыя вуліцы, разбівайце паркі, штогадзінна мацуйце абараназдольнасць нашай краіны, працуйце так, як вучыць нас наш любімы правадыр таварыш Сталін, а мы, дарагія таварышы, з падзесяцеронай энергіяй возьмемся за работу, за вучобу, каб кожны наш крок праслаўляў вялікую краіну соцыялізма.

Бывайце, дарагія сябры!

Экіпаж самалёта «Родина»:

ГРЫЗАДУБАВА, ОСІПЕНКА, РАСКОВА».

Комсамольск-на-Амуры,

15 кастрычніка.

Адважныя лётчыцы выехалі ў Хабараўск

15 кастрычніка працоўныя Комсамольска наладзілі ўрачыстыя провады гераічнаму экіпажу самалёта «Родина».

За гадзіну да адплыцця парахода дэлегацыі прадпрыемстваў, будоўляў, устаноў і навучальных устаноў сабраліся на прыстані. Тут адбыўся многалюдны мітынг.

Ад імя гарадской партыйнай арганізацыі і ўсіх працоўных Комсамольска адважных лётчыц тт. Грызадубаву, Осіпенка і Раскову вітае сакратар гарадскога камітэта партыі тав. Пегаў. Словы прывітання і самыя лепшыя пажаданні ад калектыва машынабудаўнічага завода перадае дарагім гасцям парторг цэха № 9 тав. Саседка. З яркай прамовай выступае стаханавец суднарамонтнага завода тав. Семчанка.

Выконваючы абавязкі старшыні горсовета тав. Васін ад імя працоўных Комсамольска прападносіць лётчыцам шкатулкі, на якіх паказаны карта Саюза з маршрутам пералёту, барэльефы Леніна і Сталіна, партрэты адважных гераінь тт. Грызадубавай, Осіпенка і Расковай.

З адказным словам выступіла тав. Осіпенка. Яна яшчэ раз перадала працоўным Комсамольска падзяку ўсяго экіпажа «Родины» за радушны прыём і выказала сваё захапленне прыгожым горадам, пабудаваным па волі партыі і пры бліжэйшай дапамозе таварыша Сталіна. Яна дае слова перадаць працоўным Масквы і таварышу Сталіну прывітанне комсамольчан.

У заключэнне тав. Осіпенка заклікала комсамольчан лепш працаваць, мацаваць абарону краіны, выкарчоўваць астаткі варожага ахвосця.

Мітынг закончыўся пад урачыстыя гукі «Інтэрнацыянала».

ЗА РОСКВІТ БЕЛАРУСКАЙ СОВЕЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

У АГУЛЬНЫМ росце нашай соцыялістычнай радзімы, у будаўніцтве новай чалавечай культуры вялікае месца займае совецкая літаратура. Ганаровай і пачэснай з'яўляецца работа совецкага пісьменніка. У краіне соцыялізма, дзе шчаслівая рэчаіснасць насычана багацейшымі падзеямі, дзе на кожным участку будаўніцтва творацца сапраўдныя цуды, дзе квітнеючае жыццё поўна хараства і радасці, для пісьменніка адкрыты небывалыя магчымасці. Кожная новая перамога нашай радзімы служыць для яго жывой крыніцай творчай энергіі і натхнення.

Поўнакроўна, майстэрска паказаць падзеі і людзей вялікай сталінскай эпохі, напісаць творы, якія-б у рэалістычных, яркіх, як само жыццё, вобразах адлюстроўвалі-б барацьбу вялікага совецкага народа за соцыялізм, паказвалі-б нашу рэчаіснасць, хвалявалі-б чытача высокімі чалавечымі пачуццямі, выклікалі-б яшчэ большую любоў да партыі Леніна—Сталіна, да нашай радзімы і яшчэ большы гнеў да ворагаў — гэта заветная мара кожнага совецкага пісьменніка.

Совецкая літаратура, як і совецкая навука,—гэта перадавая літаратура, якая «мае смеласць, рашучасць ламаць старыя традыцыі, нормы, устаноўкі, калі яны становяцца ўстарэлымі, калі яны ператвараюцца ў тормаз для руху наперад, і якая ўмее ствараць новыя традыцыі, новыя нормы, новыя ўстаноўкі». Гэтыя словы таварыша Сталіна, сказаныя ім на прыёме ўдзельнікаў Усесаюзнай нарады вышэйшай школы ў адносінах совецкай навукі, у такой-жа меры адносяцца і да совецкай літаратуры.

Беларуская совецкая літаратура вырасла разам з агульным ростам Совецкай Беларусі — краіны ў мінулым забітай і прыгнечанай, не меўшай да Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі сваёй дзяржаўнасці. Асабліва гэты рост беларускай совецкай літаратуры заўважаецца пасля разгрому варожых гнёздаў у пісьменніцкай арганізацыі Беларусі. Ворагі народа ўсімі мерамі шкодзілі на літаратурным фронце. Выконваючы волю сваіх гаспадароў — польска-германскіх фашыстаў,—яны разлагалі асяроддзе совецкіх пісьменнікаў, насаджалі багему, групаўшчыну, угодніцтва, засмечвалі кніжны рынак бяздарнымі тварэннямі, скажаючымі гісторыю нашага народа і сёнешнюю рэчаіснасць, дэзарыентоўвалі літаратурную моладзь.

Разгром ворагаў народа ў пісьменніцкай арганізацыі БССР паслужыў стымулам для далейшага развіцця і росквіту беларускай совецкай літаратуры. За апошні год беларускімі паэтамі і пісьменнікамі напісаны творы, якія з'яўляюцца каштоўным укладам у скарбніцу совецкай літаратуры. Да такіх твораў трэба аднесці новыя вершы народных паэтаў БССР Янкі Купалы і Якуба Коласа, паэму Пятруся Броўкі «Кацярына», раман Э. Самуйлёнка «Будучыня», новыя творы празаікаў З. Бядулі, М. Лынькова, вершы і паэмы А. Куляшова, П. Глебкі, Э. Агняцвет. Вырас цэлы рад маладых паэтаў і пісьменнікаў, творы якіх змяшчаюцца на старонках нашага перыядычнага друку.

Новыя творы з'яўляюцца яскравым доказам няўхільнага росту беларускай совецкай літаратуры. Але, адзначаючы гэты рост, было-б недапушчальнай памылкай закрываць вочы на той факт, што літаратура БССР усё-ж адстае ад агульных тэмпаў соцыялістычнага будаўніцтва, ад пастаўленых перад ёю партыяй і народам задач, ад патрабаванняў вырасшага ва ўсіх адносінах совецкага чытача. Тое, што мы яшчэ вельмі мала маем твораў, праўдзіва і ярка адлюстроўваючых сёнешнюю квітнеючую Беларусь, распрацоўваючых шырокія палотны, выходзячых за рамкі вузкага месніцтва, можна растлумачыць толькі дрэннай работай Саюза совецкіх пісьменнікаў Беларусі і перш за ўсё яго кіраўніцтва.

Асноўным абавязкам ССПБ з'яўляецца арганізацыя плённай творчай работы пісьменнікаў. У цэнтры ўвагі работы праўлення Саюза павінны стаяць творчыя пытанні. Між тым, з-за арганізацыйнай і канцылярскай мітусні, праўленне забывае пра гэтыя свае істотныя задачы. Амаль не бывала такіх выпадкаў, каб на праўленні або на сходзе Саюза абмяркоўваліся новыя творы пісьменнікаў да іх апублікавання. Работа з рукапісам, барацьба за якасць, за сучасную тэматыку, за ідэйна-палітычны рост пісьменніка — гэта пытанні, якія выпалі з поля дзейнасці праўлення Саюза. Таварыскае прынцыповае абмеркаванне твораў часта замяняецца шаблоннай адзнакай іх не па якасці, а па імені аўтара. Іменна гэтым можна тлумачыць з'яўленне на старонках газет і часопісаў твораў невысокай якасці, хоць і напісаных часам вядомымі аўтарамі.

Тэматыка беларускай совецкай літаратуры яшчэ вельмі абмежавана. Беларускі народ прайшоў вялікі шлях барацьбы. Гэта тэма астаецца нераспрацаванай, як не распрацаваны яшчэ і тэмы Вялікага Кастрычніка і грамадзянскай вайны на Беларусі. Безліч тэм падказвае пісьменніку рэчаіснасць сёнешняй Совецкай Беларусі, якая з падняволььнай краіны лясоў і балот, цемры і невуцтва стала квітнеючай краінай соцыялізма—фарпостам Совецкага Саюза на рубяжы з капіталістычным Захадам.

Прычыну слабай распрацоўкі нашымі пісьменнікамі сучаснай тэматыкі трэба шукаць у адарванасці большасці з іх ад кіпучага жыцця краіны. Творчыя камандзіроўкі — рэдкая з'ява ў ССПБ. Адсутнасць-жа сувязі пісьменнікаў з жывымі людзьмі, з героямі нашага часу, стаханаўцамі прадпрыемстваў і калгасных палёў, павярхоўнае знаёмства з навакольным жыццём—усё гэта вядзе да творчага застою, да перапеваў, да павярхоўнасці.

Актуальнейшым пытаннем работы ССПБ з'яўляецца вырошчванне маладых кадраў совецкіх пісьменнікаў. З літаратурнай моладдзю, сярод якой нямала ёсць таленавітых паэтаў і пісьменнікаў, ССПБ дагэтуль не разгарнуў сістэматычнай работы па аказанню ім творчай дапамогі, па арганізацыі высокакваліфікаванай кансультацыі, па падрыхтоўцы іх да уступлення ў Саюз. Літаратурная моладзь павінна быць акружана штодзённай увагай і клопатамі.

Нельга не сказаць некалькі слоў аб перыядычных выданнях ССПБ — газеце «Літаратура і мастацтва» і журнале «Полымя рэволюцыі». Як газета, так і журнал дагэтуль не спраўляюцца са сваімі задачамі. Іх нумары ў пераважнай большасці запаўняюцца выпадковым матэрыялам, у іх адсутнічае прынцыповая большэвіцкая крытыка новых твораў. І газету і журнал неабходна зрабіць сапраўднымі большэвіцкімі органамі Саюза, якія групавалі-б вакол сябе лепшыя літаратурныя сілы рэспублікі, літаратурную моладзь, па-большэвіцку ставілі-б перад пісьменнікамі актуальнейшыя праблемы, давалі-б чытачу новыя, высокаякасныя творы.

Работу ССПБ і перш за ўсё яго кіраўніцтва неабходна перабудаваць карэнным чынам. Перабудова павінна ісці па лініі падпарадкавання ўсёй работы Саюза творчым пытанням, сувязі пісьменнікаў з масамі, барацьбе за высокую якасць твораў, супроць усялякай халтуры, лакіроўкі і фальшы. Гэтую перабудову павінна ўзначаліць партыйная арганізацыя Саюза совецкіх пісьменнікаў Беларусі. У першую чаргу пісьменнікі-комуністы нясуць адказнасць за канчатковую ліквідацыю шкодніцтва на фронце беларускай совецкай літаратуры, за яе сёнешняе становішча.

Совецкі пісьменнік — гэта перадавы чалавек нашага часу. Яго талент служыць усенароднай справе. Яго мастацкае слова згуртоўвае масы пад сцягам партыі Леніна — Сталіна і заклікае да новых і новых перамог. Да кожнага яго слова прыслухоўваецца народ. Вялікае шчасце быць пісьменнікам краіны соцыялізма, у якой рэчаіснасць дае невычарпальны матэрыял для творчасці! Ні ў адной краіне, апрача нашай, пісьменнік не акружан такой высокай павагай, такімі бацькоўскімі клопатамі. Але, ствараючы ўсе ўмовы для пісьменніка, партыя і народ патрабуюць ад яго самаадданага служэння сваім талентам, сваім пяром вялікай справе комунізма.

Магутным дапаможнікам у рабоце совецкага пісьменніка з'явіцца выхад з друку гэтага выключнай гістарычнай важнасці дакумента, як Кароткі курс гісторыі Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў). Вывучэнне гэтага падручніка, авалоданне большэвізмам — надзённая задача кожнага партыйнага і непартыйнага пісьменніка-большэвіка.

(«ЗВЯЗДА»).

ДА НОВАГА ТЭАТРАЛЬНАГА СЕЗОНА

***

ЖАДАЕМ ТВОРЧЫХ ПОСПЕХАЎ

Сёння Беларускі Дзяржаўны тэатр оперы і балета спектаклем «Царская нявеста» Рымскага-Корсакава пачынае новы тэатральны сэзон.

Пасля перарыва, калектыў тэатра распачаў актыўную творчую работу. Творчыя работнікі тэатра ахоплены імкненнем хутчэй сустрэцца з гледачом і парадаваць яго ўзорамі опернага і балетнага мастацтва.

У рэпертуары тэатра руская класіка: «Русалка» Даргамыжскага, «Царская нявеста» Рымскага-Корсакава, балет «Лебедзінае возера» Чайкоўскага, узоры еўрапейскай класікі: «Тоска» і «Чыо-Чыо-Сан» Пучыні, «Рыгалето» Вердзі і совецкая опера «Ціхі Дон» Дзержынскага.

Але найбольш характэрным для гэтага сезона опернага тэатра з'яўляецца тое, што ўвесь калектыў тэатра напружана працуе над стварэннем беларускіх оперных твораў і балетаў. Грамадскае праслухоўванне оперы «Міхась Падгорны», пры ўдзеле народных артыстаў СССР Самасуда і Глiера, паказала, што першая беларуская опера, якая напісана Е. Цікоцкім (лібрэта П. Броўкі), з'яўляецца высокамастацкім, народным музычным творам.

Калектыў опернага тэатра вельмі інтэнсіўна працуе над гэтым творам. Поспеху оперы ў значнай меры спрыяе адданая праца дырыжора М. Э. Шнэйдэрмана, салістаў Л. П. Александроўскай, Млодэк, Цярэнцева, Дзенісава, Мурманцава, Каліноўскага і інш.

Тэатр клапатліва працуе і над іншымі беларускімі творамі: «Дрыгва», «Кацярына Жарнасек», «Салавей» і «Пагранічнікі», дапамагаючы вырошчванню новых кадраў лібрэтыстаў і оперных кампазітараў, узбагачаючы музыкальна-тэатральную культуру беларускага народа.

Тэатр прышоў да новага сезона з узмоцненым кіруючым складам у асобе галоўнага рэжысёра В. Рапапорта, галоўнага дырыжора — ордэнаносца Грубіна. Плённа працуюць у тэатры малады дырыжор Ратнер і балетмейстар Мулер. Творчы склад артыстаў оперы і балета за апошні год папоўніўся новымі спевакамі, танцаўшчыкамі і танцаўшчыцамі. Прыма-балерына З. А. Васільева вядзе вялікую работу па выхаванню нашых балетных кадраў.

Оперны тэатр мае ўсе ўмовы для таго, каб стварыць высокамастацкія спектаклі, якіх ад яго чакае совецкі глядач.

Пачынаючы новы сезон, Тэатр оперы і балета павінен узмацніць свае сувязі з масамі, з працоўным гледачом, прыслухоўвацца да крытыкі, што дапаможа яго мастацкаму росту.

Пастаянную дапамогу ў рабоце тэатра будуць аказваць і лепшыя нашы гледачы-стаханаўцы.

Жадаем нашаму Дзяржаўнаму тэатру оперы і балета выдатных творчых поспехаў!

СТВАРЫЦЬ СОВЕЦКУЮ АПЕРЭТУ

Разгорнутае на старонках газеты «Літаратура і мастацтва» абмеркаванне пытанняў новага тэатральнага сезона не можа не зацікавіць тэатральную грамадскасць.

Калі оперныя і драматычныя тэатры ў галіне ўзбагачэння свайго рэпертуара маюць значныя поспехі, дык тэатр аперэты ўсё-ж у асноўным застаецца вельмі кансерватыўным, а тэндэнцыі да перабудовы жанра аперэты не атрымалі яшчэ арганізацыйнага выражэння. Абнаўленне аперэты трэба рабіць, бясспрэчна, толькі ўзбагачэннем совецкім рэпертуарам.

У сувязі з гэтым мне і хацелася-б сказаць некалькі слоў аб тэатры аперэты БССР, які ўзнік на аснове Маскоўскага тэатра музкамеды пад кіраўніцтвам заслуж. арт. РСФСР Валерыя Бебутава.

Гэты тэатр узнік у Маскве ў 1925 годзе з створанай Бебутавым студыі, што адыграла істотную ролю ў выпрацоўцы адзінага стылю ў выканаўцаў. Але, не гледзячы на наяўнасць у тэатры раду даравітых актораў, яго ўсё-ж нельга назваць «тэатрам актора».

Ва ўсіх спектаклях, выпушчаных Бебутавым, рэжысёр і агульны ансамбль прэваліруюць над акторам. Імкнучыся да пашырэння музыкальнага фона, Бебутаў лічыў адзіным шляхам да крытычнага асваення жанра, як да этапу стварэння сучаснага тэатра аперэты,— класіку. Гэтым і тлумачыцца, што тэатр да мінулага года не меў у сваім рэпертуары ні адной так званай венскай аперэты.

У мінулым сезоне тэатр выпусціў аперэту «Вяселле ў Малінаўцы» (музыка Александрава, тэкст Юхвіда), дзе акторы ўпершыню сустрэліся з тыповымі фігурамі нашай рэчаіснасці. Не гледзячы на цяжкія ўмовы, якія былі пры выпуску гэтай п'есы (адсутнасць належнай сцэнічнай пляцоўкі), і першы вопыт тэатра ў галіне асваення совецкай тэматыкі, акторскі калектыў з гонарам справіўся з гэтай задачай, што пацвярджае поспех спектакля, які вытрымаў ужо звыш ста пастановак.

На жаль, гэта адзіная прэм'ера, паказаная за ўвесь сезон, што тлумачыцца неспрыяючымі ўмовамі, у якіх прышлося працаваць тэатру з самага пачатку яго ўзнікнення ў БССР. Не гаворачы ўжо аб пераездах з горада ў горад, не прадугледжаных ніякімі планамі, прадастаўляемыя пляцоўкі большай часткай аказаліся непрыгоднымі для работы тэатра.

У сучасны момант тэатр працуе ў Гомелі, і за ўвесь перыяд сваёй дзейнасці ўпершыню, дзякуючы добраму тэатральнаму памяшканню клуба імя Леніна, мае магчымасць разгарнуць работу.

У трупу ўліваецца рад новых актораў. Па ўказанню Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР хор будзе павялічан на 50 і аркестр да 40 чалавек. У якасці мастацкага кіраўніка зноў запрашаецца заслуж. арт. РСФСР Валерый Бебутаў.

Апрача Гомеля тэатр музкамедыі ў гэтым сезоне абслужыць Менск, Віцебск і Бабруйск. На працягу летняга перыяду тэатр мяркуе арганізаваць гастролі ў брацкіх рэспубліках.

З класікі, апрача наяўных у рэпертуары аперэт,—«Цудоўная Елена» Офенбаха, «Цыганскі барон» Штрауса і «Карневільскія званы» Планкета,—тэатр пакажа ў гэтым сезоне «Ноч у Венецыі», муз. Штрауса, у пастаноўцы В. М. Бебутава. Апрача таго, намечаны да пастаноўкі дзве аперэты Кальмана — «Апошні чардаш», тэкст Г. М. Ярона, і «Сільва», тэкст Б. Р. Рапапорта.

Галоўная-ж задача, якую тэатр ставіць перад сабою, гэта стварэнне і выпуск да дня Чырвонай Арміі арыгінальнай совецкай аперэты на беларускую тэму, выкарыстаўшы багацейшы музыкальны беларускі фальклор. Для выканання гэтай адказнай задачы мы чакаем істотнага падтрымання з боку Саюза пісьменнікаў і Саюза кампазітараў БССР, а таксама газеты «Літаратура і мастацтва».

Пастаноўка «Вяселля ў Малінаўцы» паказала, што ў нашых умовах совецкаму тэатру аперэты адкрываецца вялікі шлях для яго развіцця. Клопаты і ўвага партыі і ўрада, што аказваюцца работнікам мастацтваў і пытанням мастацтваў у цэлым, абавязваюць нас напружыць усе сілы для стварэння культурнага совецкага музыкальнага тэатра, вартага заняць ганаровае месца ў сістэме соцыялістычнага мастацтва і з гонарам насіць званне рэспубліканскага тэатра БССР.

С. Я. ТУТЭЛЬМАН.

Дырэктар Дзяржаўнага тэатра музкамедыі БССР.

***

ЗА ТВОРЧЫ ЎЗДЫМ

У 1937 годзе ў Дзяржаўным Яўрэйскім тэатры было выкрыта варожае кіраўніцтва. Ворагі народа, якія арудвалі ў тэатры, хацелі адарваць Дзяржаўны Яўрэйскі тэатр БССР не толькі ад шырокіх мас, ад гледача, але і ад совецкай драматургіі. Рэшткі гэтага шкодніцтва да гэтага часу не ліквідаваны. Тэатр яшчэ не наладзіў сталай творчай сувязі з драматургамі і не стварыў ні аднаго поўнацэннага спектакля аб нашай соцыялістычнай рэчаіснасці.

К канцу 1937 года перад тэатрам паўстала востра пытанне аб стварэнні новага рэпертуара, аб пераглядзе ўсёй творчай лініі.

Упраўленне па справах мастацтваў, у якім да нядаўняга часу арудвалі ворагі народа, не ўмацоўвала тэатр ні мастацкім кіраўніцтвам, ні вопытным дырэктарам. У такім становішчы калектыву тэатра цяжка было змагацца за вырашэнне самых неадкладных творчых пытанняў. Гэтым тлумачыцца тое, што рэпертуар 1938 года быў недастаткова прадуманым і часам выпадковым. Такія п'есы, як «Агні маяка» Карасева і «У нашы дні» Вашанцава, трапіўшыя ў рэпертуар тэатра, адnялі шмат творчай энергіі ў калектыва, але ні ідэйна, ні мастацка не ўзбагацілі яго.

Варожае кіраўніцтва тэатра ігнаравала ўключэнне ў рэпертуар яўрэйскіх класікаў. Толькі ў апошні перыяд тэатр распачаў работу над класікай. Пастаноўкі «Менахем-Мендл» — інсцэніроўка Олендэра па Шолам-Алейхему, пастаноўка Сокала, «Суламіф» — Галкіна па Гольдфадэну, пастаноўка Галаўчынера і апошняя работа, з якою тэатр прыходзіць да 80-годдзя з дня нараджэння Шолам-Алейхема — «Тэв'е дэр мілхікер» — інсцэніроўка Олендэра, пастаноўка Сокала — з'яўляюцца значным дасягненнем тэатра ў галіне авалодання класічнай спадчынай.

Новыя пастаноўкі тэатра вельмі цёпла сустрэты гледачом у часе гастрольнай паездкі па гарадах РСФСР і БССР.

К канцу 1938 года тэатр закончыць яшчэ дзве пастаноўкі. Першая—«Лейбке-салдат» Н. Левіна ў пастаноўцы А. Трэпеля. Тав. Левін (актор тэатра)— малады і здольны пачынаючы драматург. «Лейбке-салдат» — яго першая п'еса на тэму аб імперыялістычнай вайне. Н. Левін працуе ў цесным кантакце з тэатрам. І ў прысутнасці з рэжысурай, якая аказала яму вялікую дапамогу. Гэту пастаноўку тэатр пакажа ў пачатку лістапада.

Другая п'еса, над пастаноўкай якой тэатр распачынае работу,—«Бертольд Опенгейм», па Фейхтвангеру, у інсцэніроўцы Н. Левіна. Гэта работа прысвячаецца 20-годдзю ВЛКСМ.

Наступнай пастаноўкай будзе п'еса Галкіна «Бар-Кохба». Аўтар зрабіў для тэатра спецыяльны варыянт п'есы. Ставіць яе рэжысёр В. Галаўчынер. Прэм'ера адбудзецца ў студзені 1939 г.

Даўно імкнецца тэатр паказаць спектакль аб совецкай жанчыне. У сувязі з гэтым тэатр уключыў у рэпертуар 1939 года п'есу Арбузава «Таня».

Імкнучыся паказаць вялікі вобраз геніяльнага правадыра рэвалюцыі — таварыша В. І. Леніна, тэатр уключыў у рэпертуар 1939 года п'есу аб Леніне, якую піша для тэатра Перэц Маркіш. Сучасную совецкую камедыю піша для тэатра Ш. Галкін.

У 1939 годзе тэатр паставіць п'есу М. Даніэля «Шлойме Маймон». Шлойме Маймон — вобраз яўрэйскага асветніка-філосафа XVIII стагоддзя. М. Даніэль у п'есе паказвае як Шлойме Маймон — чалавек з народа — падымаецца да вяршынь ідэалістычнай філасофіі, як ён паўстае супроць яе, супрацьстаўляе ёй асновы матэрыялістычнай філасофіі.

Тэатр лічыць што ў пастаноўцы «Фальшывай манеты» не справіўся з праблемай пастаноўкі Горкага на яўрэйскай сцэне. Таму тэатр уключыў у рэпертуар «Васу Жэлезнову».

На працягу 15 год тэатр не рабіў спроб перакласці на мову сцэнічных вобразаў творы буйнейшага класіка Мендэле-Мойхер-Сфорым.

На 1939 год уключана ў рэпертуар п'еса па Мендэле-Мойхер-Сфорым, якую пішуць для тэатра З. Аксельрод і Э. Каган.

Самым слабым бокам рэпертуарнага плана на 1939 год застаецца зноў-такі пытанне совецкай тэматыкі. Каб запоўніць гэты вялікі прабел, тэатр пачынае цяпер узмоцненую работу з драматургамі.

Творчая сувязь з нашымі яўрэйскімі і беларускімі пісьменнікамі павінна ўзбагаціць тэатр у бягучым сезоне п'есамі аб квітнеючай Совецкай Беларусі, аб бароннай магутнасці нашай краіны.

Тэатр мяркуе ўключыць у рэпертуар рад твораў аб совецкай рэчаіснасці, якія належаць пяру драматургаў братніх рэспублік.

Калектыў тэатра даўно марыць аб пастаноўцы адной з камедый Шэкспіра. Гэта задача таксама ў гэтым годзе будзе ажыццёўлена.

Тэатр мае ўсе магчымасці для творчага ўздыму. Але па-ранейшаму ў тэатры няма патрэбнага мастацкага кіраўніцтва. Упраўленне па справах мастацтваў павінна забяспечыць тэатр высокакваліфікаваным сталым мастацкім кіраўніком.

З. Л.



Студыя Ленфільм да 21-й гадавіны Кастрычніка выпускае на экран новы гісторыка-рэволюцыйны гукавы фільм «Чалавек з ружжом». Ставіць карціну заслужаны дзеяч мастацтваў С. С. Юткевіч па сцэнарыю Н. Пагодзіна.

На здымку—кадр з фільма. В. І. ЛЕНІН (заслуж. арт. М. Штраух) і ШАДРЫН (арт. Б. Тэнін). Саюзфото.

***

АБМЕРКАВАННЕ РЭПЕРТУАРНЫХ ПЛАНАЎ

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР пачало разгляд і абмеркаванне рэпертуарных планаў тэатраў на 1939 год.

Першым ва Упраўленні быў абмяркован рэпертуарны план Дзяржаўнага Яўрэйскага тэатра БССР. Сваёй галоўнай задачай у 1939 годзе тэатр ставіць ажыццяўленне пастаноўкі п'есы аб геніі рэволюцыі — вялікім Леніне. Тэатр уключае ў рэпертуар рад арыгінальных сучасных п'ес і некалькі класічных п'ес.

Выступаўшыя на нарадзе творчыя работнікі тэатра—тт. Гурэвіч, Олендэр, Моін, Сокал, Герман і інш. — адзначылі, што ў мінулым тэатральным сезоне ў Яўрэйскім тэатры не было клопатаў аб узбагачэнні рэпертуара совецкімі п'есамі, стварэнні спектакляў высокай мастацкай каштоўнасці аб нашай рэчаіснасці. Тэатр браў п'есы выпадковыя, нізкага ідэйнага і мастацкага ўзроўню і ствараў убогія, нездавальняючыя гледача, спектаклі. Гэта — суровы ўрок. Зараз патрэбен карэнны пералом у рабоце тэатра. У рэпертуары тэатра павінны быць лепшыя п'есы совецкіх драматургаў, павінны быць створаны яркія спектаклі аб нашай цудоўнай рэчаіснасці. Патрэбна ўстанавіць творчую сувязь з драматургамі і ўзбагаціць рэпертуар арыгінальнымі п'есамі аб Совецкай Беларусі. Пастаноўкам совецкіх п'ес павінна быць аддана галоўная ўвага тэатра.

На аснове зробленых на нарадзе заўваг тэатр зараз дэтальна распрацоўвае свой рэпертуарны план на 1939 год.

Другім ва Упраўленні па справах мастацтваў абмяркован рэпертуарны план Дзяржаўнага Рускага тэатра БССР. Рускі тэатр у надыходзячым сезоне павінен паказаць гледачу лепшыя п'есы совецкіх драматургаў і выдатнейшыя творы класічнай спадчыны.

Пры абмеркаванні рэпертуарнага плана былі зроблены каштоўныя заўвагі, улічваючы якія тэатр у бліжэйшыя дні распрацуе свой рэпертуарны план на будучы год.

**

Гэтымі днямі ва Упраўленні па справах мастацтваў пры СНК БССР адбылася чарговая нарада, прысвечаная разгляду рэпертуарных планаў тэатраў БССР на 1939 год.

На нарадзе быў заслухан план новага тэатральнага сезона 1939 года Дзяржаўнага Віцебскага драматычнага тэатра.

У абмеркаванні гэтага рэпертуарнага плана прынялі ўдзел работнікі тэатраў і Упраўлення: тт. Віньяр, Юдэлевіч, Малчанаў, Вялікі, Мазалеўская, Стальскі, Дорскі, Рамановіч, Азірскі.

Выступаючыя ў спрэчках таварышы адзначылі, што рэпертуарны план тэатра недастаткова абмяркоўваўся ў творчым калектыве, у ім мала прадстаўлена арыгінальных п'ес беларускіх аўтараў, а таксама твораў сучасных драматургаў братніх рэспублік. Затое ўключаны ў план п'есы совецкіх аўтараў, з якімі калектыў тэатра яшчэ нават не знаём. У падборы класічных твораў у плане вызначаны толькі імёны аўтараў, а адносна канкрэтных твораў у калектыве яшчэ не дагаварыліся. Таму на нарадзе акторы прапанавалі безліч п'ес, не прытрымліваючыся ніякіх прынцыпаў, выходзячы з уласнага густу.

Работнікам Дзяржаўнага Віцебскага драмтэатра трэба пазнаёміцца з навінкамі совецкай драматургіі. Неабходна, каб тэатр яшчэ мацней звязаўся з беларускімі совецкімі драматургамі і клапаціўся аб стварэнні новых арыгінальных п'ес. У Віцебскім тэатры для стварэння арыгінальных твораў ёсць усе магчымасці. Увесь творчы калектыў тэатра павінен прыняць самы актыўны ўдзел у стварэнні рэпертуарнага плана. Трэба ўлічыць усе магчымасці свайго калектыва і скласці такі рэпертуарны план, каб тэатру па сілах было яго выканаць.

Тут-жа на пасяджэнні быў заслухан рэпертуарны план Дзяржаўнага Беларускага драматычнага тэатра. Мастацкі кіраўнік тэатра тав. Рахленка паведаміў, што 1938 год калектыў закончыць двума спектаклямі — «Кацярына Жарнасек» М. Клімковіча і «Сапраўднае жыццё» Войцэхава і Ленча.

Для Белдзяржрамтэатра зараз піша сатырычную камедыю К. Крапіва і над новай п'есай працуе М. Клімковіч, у якой будзе адлюстравана барацьба працоўных з белапалякамі і роля таварыша Сталіна ў стварэнні беларускай дзяржаўнасці.

З сучасных совецкіх п'ес у план 1939 г. уключаны — «Ключы Берліна» Фіна і Гуса і «Воўк» Леонава.

Класіка ў рэпертуары 1939 года прадстаўлена М. Горкім—«Ворагі», К. Гальдоні — «Лгун», Шэкспірам—«Отэлло».

Падрыхтоўка шэкспіраўскага спектакля часткова будзе перанесена на 1940 год. Гэта з тае прычыны, што тэатр хоча сур'ёзна падрыхтавацца да гэтай адказнай работы.

Нарэшце, у рэпертуары беларускіх тэатраў з'явіліся творы выдатнага англійскага драматурга. Культурныя запатрабаванні гледача ўзраслі. Побач з п'есамі совецкіх аўтараў, рускіх і замежных класікаў, совецкі глядач БССР хоча бачыць высокамастацкія і гістарычна праўдзівыя камедыі і трагедыі выдатнага песняра Адраджэння—Шэкспіра, якія ўзбагацяць яго памяць цікавымі думкамі і глыбокімі, поўнакроўнымі мастацкімі вобразамі.

Акторы нашага беларускага тэатра жадаюць спрабаваць свае сілы на адказным і высокамастацкім драматургічным матэрыяле, што яшчэ больш будзе спрыяць іх творчаму росту. Для ажыццяўлення гэтага спектакля будзе запрошан адзін з лепшых рэжысёраў совецкага тэатра, у якога будуць плённа вучыцца і расці беларускія акторы і рэжысёры.

Выступаючыя ў спрэчках таварышы Мазалеўская, Юдэлевіч, Віньяр, Стальскі, Малчанаў, Галубіцкая і Азірскі адзначылі, што рэпертуарны план Белдзяржрамтэатра цікавы і складзен калектывам тэатра старанна і сур'ёзна.

Тут-жа былі адзначаны і недахопы гэтага плана, — што не ўключана совецкая камедыя, трэба падумаць над заменай камедыі Гальдоні, паколькі тэатр ужо мае ў сваім рэпертуары п'есу гэтага аўтара — «Слуга двух паноў». Раілі павялічыць колькасць совецкіх п'ес за лік драматургічных навінак гэтага і будучага гадоў.

ДЭКАДА СОВЕЦКАЙ МУЗЫКІ

У лістападзе па Совецкаму Саюзу арганізуецца дэкада совецкай музыкі. Рад канцэртаў будзе дадзен і ў БССР. Дзяржаўная філармонія БССР арганізуе ў Менску дзесяць канцэртаў. У іх прымуць удзел калектывы Філармоніі— сімфанічны аркестр, аркестр беларускіх народных інструментаў, хор, ансамбль песні і танца, а таксама піяніст Клумаў, скрыпач Амітон і салісты Тэатра оперы і балета.

Для ўдзелу ў дэкадзе запрошаны заслужаная артыстка рэспублікі Ірма Яунзем, народная артыстка СССР — ордэнаносец Дзержынская, Вера Духаўская.

У праграме дэкады — творы Мяскоўскага, Хачатурана, Кабалеўскага, Шастаковіча, Хрэннікава, Гліера, Дунаеўскага, Будашкіна, Пракоф'ева, Дзержынскага, бр. Пакрас, Залатарова, Цікоцкага, Туранкова, Багатырова, Ефімава, Шчэглова, Касенка, Данкевіча, Глушакова, Аракішвілі і інш.

РЭПЕРТУАРНЫ ПЛАН— АСНОВА РАБОТЫ

Вядома, што рэпертуар тэатра вызначае ідэйна-палітычны і творчы напрамак, з'яўляецца асновай жыцця і работы тэатра. Аднак, адносіны нашых тэатраў да складання рэпертуарных планаў часам не адпавядаюць ролі і значэнню іх. Часам пры ўключэнні п'есы ў рэпертуар улічваюць меркаванні вузка камерцыйнага парадку, або п'еса ўключаецца ў рэпертуар, выходзячы з густаў і творчых меркаванняў асабіста мастацкага кіраўніка ці рэжысёра-пастаноўшчыка.

Рэпертуарны план тэатра павінен складацца выходзячы з запатрабаванняў гледача і задач палітычнага і мастацкага выхавання калектыва тэатра. Рэпертуарны план павінен быць перспектыўным. Тэатр павінен намячаць і тыя п'есы, да пастаноўкі якіх трэба імкнуцца, якія з'яўляюцца вяршынямі сусветнага мастацтва. Рэпертуарны план павінен дапамагаць росту культуры тэатра, усямерна садзейнічаць росту і развіццю нацыянальнай па форме, соцыялістычнай па зместу драматургіі.

І, нарэшце—рэпертуарны план тэатра павінен будавацца на аснове добра прадуманага і змястоўнага тэматычнага плана, які складаецца з шырокага круга тэм, якія тэатр на працягу некалькіх год павінен рэалізаваць у сваёй практыцы.

На шляху да рэалізацыі ўсіх гэтых прынцыповых меркаванняў стаяць вялікія цяжкасці, якія бывае часам нялёгка перамагчы.

Планіраваць рэпертуар для нашых тэатраў неабходна, бо інакш мы ніколі не пазбегнем выпадковасці і заўсёды будзем мець тое, што адна тэма будзе прадстаўлена ў двух-трох спектаклях, а другая, не менш актуальная, будзе адсутнічаць зусім. Тое-ж датычыць і жанраў. Неабходна, каб у рэпертуары тэатра былі прадстаўлены розныя жанры — камедыя, трагедыя, драма.

Што датычыць якасці, мастацкай каштоўнасці п'есы, то ў нас часам, разважаюць так: беларуская драматургія яшчэ маладая, да яе можна змяншыць патрабаванні. Гэта няправільны шлях, на які нельга станавіцца, таму што мы гэтым самым не дапамагаем нашым драматургам творча расці, не даем высокаякаснага матэрыялу акторам.

Аднак, ці азначае гэта, што мы павінны паставіць перад сабою такія высокія патрабаванні, перад якімі не ўстаіць ні адна свежая арыгінальная п'еса і мы павінны будзем арыентавацца толькі на высокія ўзоры класікі? Ці павінны мы адмовіцца ад пастаноўкі п'ес на злабадзённыя тэмы, якіх так патрабуе ад нас глядач? Бясспрэчна, не. Гэта было-б няправільна. Калі нас хвалюе тэма пільнасці, мы павінны пазнаёміцца з усімі тымі п'есамі, якія трактуюць гэтую тэму, і выбраць лепшую з іх і паставіць, дамагаючыся ад аўтара ўсямернага палепшання твору, мабілізуючы на пастаноўку яго лепшыя сілы тэатра. Ці павінны былі мы ставіць п'есу Л. Шэйніна і бр. Тур «Вочную стаўку», злабадзённую па сваёй тэматыцы, але слабую па літаратурных якасцях? Бясспрэчна, павінны былі, бо яна паказвае хвалюючыя нас падзеі.

Але нашто ўключаць у рэпертуар, як гэта зрабіў Віцебскі Белдзяржрамтэатр, апроч «Вочнай стаўкі» яшчэ і «Агні маяка» і «Тайну»—п'есы вельмі нізкай літаратурнай якасці і прыблізна на адну і тую-ж тэму. Гэта ўжо— пагоня за лёгкім поспехам у гледача, а не сур'ёзныя клопаты аб яго ідэйна-мастацкім выхаванні. Нашы тэатры ставяць у год па дзве-тры, перакладзеных з мовы іншых братніх рэспублік, п'есы совецкіх драматургаў, і мы абавязаны выбраць лепшае, што ёсць у гэтай драматургіі. «Агні маяка» і «Тайна»—не лепшае ў рускай совецкай драматургіі.

Не менш важнай праблемай рэпертуарнага плана з'яўляецца колькасць уключаных у гадавы рэпертуарны план п'ес. Беларускі дзяржаўны драматычны тэатр на першых этапах свайго развіцця (1920—1925 гг.) ставіў па 15—20 пастановак у год. Праўда, сюды ўваходзілі і п'есы-мініяцюры, аднаактаўкі, двухактаўкі. Зразумела, такая вялікая колькасць п'ес не магла забяспечыць якасці іх пастаноўкі на сцэне. Быў час, калі тэатр кінуўся ў другую процілегласць—ставіў у год дзве, тры новыя пастаноўкі (1932—33—34 гг.).

У гэтым, 1938 годзе, Дзяржаўны Беларускі драматычны тэатр выпускае пяць прэм'ер. Пастаўлены: «Без віны вінаватыя» А. Астроўскага, «Непакойная старасць» Л. Рахманава, «Партызаны» К. Крапівы. У дні святкавання XXI гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі выйдзе прэм'ера «Кацярына Жарнасек» М. Клімковіча і к канцу года павінна быць пастаўлена п'еса рускіх совецкіх драматургаў Войцэхава і Ленча—«Сапраўднае жыццё».

На будучы 1939 год намечана да пастаноўкі 6 прэм'ер і сумеснымі сіламі актораў і актораў-практыкантаў тэатра (былыя студыйцы) будзе выпушчана камедыя К. Гальдоні «Слуга двух паноў».

У рэпертуар наступнага года ўключаны: «Пагібель воўка», новая п'еса Эдуарда Самуйлёнка, «Ворагі» М. Горкага, «Воўк» Л. Леонава, «Ключы Берліна» К. Фіна і Гуса.

Рэпертуарны план тэатра вызначае яго ідэйна-мастацкі твар. Нездарма некалі ворагі народа—нацыянал-фашысты—упарта не пускалі на беларускую сцэну п'есы вялікага пролетарскага драматурга Максіма Горкага, хлусячы аб іх нецікавасці. Нездарма аб вялікім рускім драматургу А. Астроўскім была гаворка, што яго п'есы трацяць у перакладзе на беларускую мову ўсю сваю якасць, бо яны спецыфічна рускія. Незадарма нацыянал-фашысты ўзнялі барацьбу супроць пастаноўкі ў Белдзяржтрамтэатры такіх выдатных совецкіх п'ес, як «Бронецягнік» Ус. Іванава, «Мяцеж» Д. Фурманава. Ненавідзячы ўсё совецкае, яны ненавідзелі ўсё рускае, ведаючы што рускі рабочы клас дапамог беларускаму народу ў яго вызваленні ад векавога прыгнёту і брацка дапамагае ў будаўніцтве шчаслівага соцыялістычнага жыцця.

Працуючы зараз над стварэннем арыгінальнай беларускай совецкай драматургіі, тэатр імкнецца знайсці такія метады і формы работы з драматургам, якія-б былі найбольш творча паспяховымі, якія-б зблізілі тэатр з драматургам настолькі, каб можна было мець адну мову, адны жаданні ў вырашэнні тых вялікіх задач, што ставіць перад беларускім совецкім мастацтвам большавіцкая партыя і совецкі ўрад.

Дзякуючы цеснаму супрацоўніцтву тэатра з драматургамі, нам удалося стварыць такія значныя спектаклі, як «Салавей» З. Бядулі, «Партызаны» К. Крапівы і рыхтуемая прэм'ера «Кацярына Жарнасек» М. Клімковіча. Драматычная паэма «Кацярына Жарнасек» з высокім драматызмам і сапраўднай паэтычнай усхваляванасцю малюе карціну народнага паўстання, барацьбы беларускага народа з сваімі адвечнымі ворагам—польскімі панамі—у XVI стагоддзі.

П'еса «Салавей» З. Бядулі паказвае другі этап гэтай барацьбы XVIII стагоддзя.

П'еса «Партызаны» К. Крапівы паказвае, як рускі рабочы клас і Чырвоная Армія дапамаглі беларускаму народу вызваліцца ад белапольскіх акупантаў.

Чарговая задача, якая стаіць перад тэатрам, гэта—стварыць спектакль, у якім-бы была паказана выдатная роля таварыша Сталіна ў стварэнні Беларускай ССР. Тэатр разлічвае на новую п'есу М. Клімковіча, які ставіць перад сабою гэтую высокую задачу.

Аб ролі і значэнні БССР, як баявога фарпоста соцыялізма на граніцы з капіталістычным Захадам, піша п'есу Эдуард Самуйлёнак. П'еса павінна паказаць падзеі нашых дзён.

Ад Кандрата Крапівы мы чакаем камедыі на сучасную тэму.

Тэатр імкнецца забяспечыць свой рэпертуарны план новымі арыгінальнымі творамі беларускіх совецкіх драматургаў. Ён для гэтага робіць рад захадаў дагаварваючыся з пісьменнікамі, звярочваючыся да ўсёй літаратурнай грамадскасці з заклікам пісаць для тэатра, прыходзіць у тэатр за кансультацыяй і ўсякай іншай творчай дапамогай.

Тэатр асаблівую ўвагу і садзейнічанне гатоў аказаць аўтарам, якія працуюць над матэрыялам сёнешняга дня, над п'есамі якія мабілізуюць нашу ўвагу навакол пытанняў абароны краіны.

Е. РАМАНОВІЧ.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

ПАД ЗНАКАМ БОЛЬШЭВІЦКАЙ КРЫТЫКІ

Даклад тав. А. Есакова на партыйна-комсамольскім сходзе ССПБ (14 кастрычніка) аб рабоце камітэта ЛКСМБ нікога не задаволіў таму, што ён быў занадта агульны і палітычна бяззубы.

Затое спрэчкі, якія разгарнуліся па яго дакладу, запоўнілі тое, пра што не гаварыў Есакоў і далі палітычна вострую ацэнку важнейшым фактам літаратурнага жыцця і дзейнасці комсамольскай арганізацыі.

Тт. Лынькоў, Клімковіч, Мальцінскі, гаварылі аб творчым росце комсамольцаў-літаратараў і росце іх удзельнай вагі ў літаратурнай арганізацыі. У першую чаргу гэта датычыцца А. Куляшова, які напісаў добрую паэму «У зялёнай дуброве», знайшоўшую агульную станоўчую ацэнку пісьменнікаў.

Таварышы адзначылі творчы рост паэтаў-комсамольцаў Агняцвет, Панчанка, Калачынскага, Мальцінскага і інш.

Комсамольская арганізацыя падрыхтавала зборнік твораў да XX-годдзя ленінска-сталінскага комсамола.

Асабліва востра было пастаўлена пытанне аб недахопах у рабоце комсамольскай арганізацыі ССПБ. Пра гэта гаварылі тт. Стаховіч, Куляшоў, Шарапаў, Модэль, Кучар, Клімковіч і Лынькоў.

Таварышы правільна ўказвалі, што камітэт ЛКСМБ зусім не займаўся творчасцю членаў арганізацыі. Не ў пашане была і работа па арганізацыі палітвучобы. Камітэт зусім абышоў задачы падрыхтоўкі комсамольцаў у партыю і пытанне росту комсамола.

У комсамольскай арганізацыі ССПБ ёсць многа членаў з вялікім стажам: Есакоў, Ліўшыц, Кучар, Мальцінскі і інш. Аднак, камітэт ЛКСМБ нічога не зрабіў для высвятлення таго, ці падрыхтаваны гэтыя таварышы для ўступлення ў партыю, ці можа некаторых з іх, як пераросткаў, зусім патрэбна вызваліць з комсамола.

У арганізацыі ёсць аднадушная думка, што Эдзі Агняцвет падрыхтавана для ўступлення ў партыю, аднак і тут камітэт ЛКСМБ нічога не робіць для паскарэння дачы рэкамендацыі т. Агняцвет для ўступлення ў партыю.

На сходзе рэзка і справядліва крытыкавалі некаторых паасобных комсамольцаў. Таварышы ў спрэчках гаварылі пра тое, што Кучар недастаткова дысцыплінаваны і вытрыманы, што ён як крытык за апошні год вельмі мала сябе праяўляе. Гаварылі пра тое, што тав. Кучару яшчэ не заўсёды хапае большэвіцкай мужнасці прынцыпова востра крытыкаваць творы ўсіх пісьменнікаў, незалежна ад іх «літаратурнага рангу» і стажу. Тав. Кучар на сходзе не даў вычарпальнага адказу на пытанне, што перашкаджае яму падрыхтавацца да ўступлення ў рады партыі Леніна—Сталіна.

Рэзкай і заслужанай крытыцы былі падвергнуты неэтычныя ўчынкі тав. Шарапава. Аднак, сход адзначыў, што Шарапаў за апошні час стаў на шлях выпраўлення сваіх паводзін. Шарапаў стаў больш актыўны, як літаратар.

Правільныя ўказанні былі зроблены тав. Есакову, у якога вельмі часта нехапае прынцыповасці, уласнай думкі на з'явы мастацкага жыцця, мужнасці цвёрда адстаяць сваю думку да канца.

На сходзе аднадушна было адзначана, што перадавы артыкул газеты «Звязда» аб беларускай літаратуры, артыкулы «Литературной газеты» пра газету «ЛІМ» і Саюз пісьменнікаў сваёй крытыкай дапамагаюць палепшыць работу ўсёй літаратурнай арганізацыі.

Разам з тым, у сваіх выступленнях, тт. Кучар, Клімковіч, Мальцінскі і інш. рэзка супярэчылі супроць таго раздзела артыкула тав. Вайцінскай, дзе яна піша, што партыйна-комсамольскае ядро Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР няздольна кіраваць літаратурнай арганізацыяй.

Не згадзіліся выступаўшыя на сходзе таварышы з ацэнкай дзейнасці ў БССР тав. Бахмецьева (прадстаўнік ССП СССР), якая дадзена ў артыкуле т. Вайцінскай у «Литературной газете». Па агульнаму прызнанню, ён па-большэвіцку правільна арыентаваў літаратурную арганізацыю і аказаў дапамогу ў вырашэнні хвалюючых пытанняў літаратурнага жыцця.

М. Н.

---o---

У партарганізацыі ССПБ

Партарганізацыя ССПБ абмеркавала артыкулы тт. Ушакова і Вайцінскай, надрукаваныя ў «Литературной газете», у якіх крытыкавалася работа газеты «Літаратура і мастацтва» і праўлення Саюза пісьменнікаў БССР.

Агульны сход партарганізацыі прызнаў рэзкую крытыку работы і палітычных памылак газеты «Літаратура і мастацтва» і праўлення ССПБ у асноўным правільнай.

У рэзалюцыі сказана, што праўленне саюза і партарганізацыя не дабіліся павароту беларускіх пісьменнікаў да актуальнай сучаснай — абароннай і індустрыяльнай тэматыкі, не згуртавалі пісьменнікаў вакол партарганізацыі, не разгарнулі крытыкі і самакрытыкі работы праўлення і партарганізацыі і не зрабілі належных вывадаў з крытыкі, якая разгарнулася ў друку і на сходах пісьменнікаў.

Партарганізацыя прызнала правільнай крытыку газеты «Літаратура і мастацтва» і яе рэдактара тав. Гурскага. Сход партарганізацыі адзначыў, што газета па раду пытанняў літаратуры і мастацтва не заўсёды займала прынцыповую пазіцыю і часам не мела ўласнай думкі, мала ўздымала прынцыповых пытанняў літаратуры і мастацтва і не займалася большэвіцкім падборам работнікаў у апарат газеты.

Рэзалюцыя рэзка крытыкуе еаяўнасць у партарганізацыі і Саюзе пісьменнікаў самазаспакоенасці і нічым не апраўданай благадушнасці, не гледзячы на тое, што ў апошні час органамі НКВД выкрыты ворагі народа ў пісьменніцкай арганізацыі.

Партарганізацыя ССПБ у сваёй рэзалюцыі катэгарычна супярэчыць супроць агульнага ахайвання ў артыкуле т. Вайцінскай усёй партыйнай і комсамольскай арганізацыі ССПБ і не згодна з ацэнкай, якая дадзена ў яе артыкуле дзейнасці тав. Бахмецьева ў часе яго знаходжання ў Менску.

У рэзалюцыі намечаны канкрэтныя мерапрыемствы па паляпшэнню работы партарганізацыі, праўлення ССПБ і газеты «Літаратура і мастацтва».

ДА НАРАДЫ ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БАВА

ПІСЬМЕННІКІ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Бойцы, командиры всегда говорят:
— За родину нашу мы станем все в ряд,
И будем сражаться с врагом до конца,
Нас глаз не обманет и хватит свинца.

Гэтыя простыя словы належаць пяру пачынаючага чырвонаармейскага паэта, чырвонаармейца Нікалая Сідарава. Яны не з'яўляюць вышынёй паэтычнага стылю і вобраза, але затое перадаюць шчырыя пачуцці і настроі байцоў і камандзіраў нашай Чырвонай Арміі. У гэтых радках перададзены велізарны і глыбокі змест любві да маці-радзімы.

Враги зубы точат давно, уж давно,
Но к нам не прорваться им все-равно.
В сердцах наших Ленин и Сталин горят.
— В боях не отступим!— бойцы говорят.

Баец-паэт праяўляе найглыбейшае пачуццё адданасці вялікаму Сталіну, партыі Леніна—Сталіна, і пачуццё гэтае — пачуццё ўсёй магутнай Чырвонай Арміі, усяго народа. «В боях не отступим!—бойцы говорят». Гэта гаворыць уся краіна, увесь шматмільённы совецкі народ, гаворыць вуснамі байца, які, сёння напісаўшы пранікнёны верш, заўтра будзе ў страю, у калоне такіх-жа байцоў крушыць фашысцкія банды.

Паэт, ст. палітрук М. Кручкін у вершы «Отчизна» піша:

Хребты страны моей суровы, величавы,—
Вершины в небо упершись стоят,
И если у границ пройдет бандит-пират
В кровавых поисках добычи, власти, славы,
Я встану первым у родной заставы,
Как брат солдата и как родины солдат.

Пачуццё брацкага інтэрнацыяналізма заўсёды было ўласціва вялікадушнаму совецкаму народу, яно не чужда і байцам Чырвонай Арміі; байцы Чырвонай Арміі—гэта байцы вялікага народа, які змагаецца за ідэі сапраўднага чалавечага гуманізма. Але народ наш заўсёды магутны і боездольны, каб у кожную хвіліну з усёй сваёй страшнай для ворага бязлітаснасцю спыніць прошукі фашысцкіх агрэсараў.

Чырвонаармейскі паэт Н. Орлоўскі ў вершы «Щчасце» перадае:

И мы с тобой, ты помнишь, распевали
Под солнцем мая радостно звеня,
О самом мудром, о великом Сталине,
О человеке воли и огня.
И с этой песней в грезы и ненастье
Пойдем сражаться в будущих боях.
И будут петь о тех, кто это счастье
Сумел навеки отстоять.

Гатоўнасць да бою, натхнёная імем найвялікшага ў свеце чалавека — Сталіна, апетага і апяваемага ў гераічных песнях, залог будучых перамог. Песня аб правадыру, прапетая перад боем, моцная як несакрушальная зброя, як магутная сіла, сіла ўзнімаючая на подвіг.

Вось аб чым пішуць маладыя чырвонаармейскія паэты, перадаючы пачуцці свае і байцоў, пачуцці палкіх патрыётаў радзімы.

І чырвонаармейскі верш, перш чым з'явіцца на старонках чырвонаармейскіх газет, ідзе ў масу байцоў, дзе як полымя распаляе яшчэ больш сэрцы чырвонаармейцаў, рыхтуючы іх да адбіцця варожых нападаў недалёкага будучага.

Чырвонаармейскі паэт хутка і жыва рэагуе на ўсе падзеі. Можна прывесці сотні вершаў, накіраваных супроць зарваўшагася фашызма. У вершах гэтых апяваецца няломная сіла шматмільённага совецкага народа, брацтва і адзінства якога магутна ўмацаваны пад радужным праменням адзінаццаціпорнага сузор'я Сталінскай Канстытуцыі. У вершах гэтых спяваецца аб гатоўнасці гераічных палкоў Чырвонай Арміі рынуцца на ворага па першаму трывожнаму сігналу. Баец-паэт з гордасцю апявае сваю любімую і родную Чырвоную Армію і марыць аб бліскучых перамогах яе ў будучых баях. І гэта не проста мара дзеля мары, а гэта рэальна-праўдзівая рэчаіснасць, бо кожнаму ясна, што няма ў свеце такой арміі, якая магла-б перамагчы армію Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік.

Баец-паэт піша аб гераічным мінулым — аб днях грамадзянскай вайны; ён піша аб сёнешніх тактычных вучэннях і аб квітнеючых калгасах неабсяжнай краіны соцыялізма. Ен піша аб любві да дзяўчыны і аб старэнькай маці, якая страціла сына-пагранічніка і пасылае — на змену сыну старэйшаму — свайго малодшага і апошняга сына. Баец-паэт піша песні, і іх спяваюць яго таварышы; гэтыя песні павядуць роты і эскадроны ў бой. Байцы складаюць частушкі і пішуць апавяданні з жыцця і быту часцей.

У часцях БАВА налічваецца да 100 чалавек літаратурна-творчага актыва маладых і пачынаючых чырвонаармейскіх пісьменнікаў. Многія з іх друкуюцца на старонках «Красноармейской правды», у журналах і газетах БССР і Смаленскай вобласці, частка друкуецца ў сталічным друку. Сярод гэтага актыва вялмала здольных, таленавітых людзей. Гэты вялікі і плённы актыў добра вядомы чырвонаармейскім масам, але, на жаль, рабоце з імі да гэтага часу яшчэ аддаецца мала ўвагі. «Красноармейская правда» за апошні час стала арганізоўваць на сваіх старонках літаратурныя падборкі, але работа кансультацыйнага парадку вядзецца пакуль яшчэ ад выпадку да выпадку і бессістэмна.

Задача палітарганаў БАВА і ССПБ дапамагчы творчай рабоце пісьменнікаў і паэтаў-байцоў, даўшы ёй адпаведны палітычны і мастацкі кірунак, правільна арганізаваўшы творчасць, забяспечыўшы высокакваліфікаваную кансультацыю. Можа быць нават трэба было-б падумаць аб арганізацыі пры праўленні ССПБ сектара па рабоце з пісьменніцкім актывам часцей БАВА. Неабходна таксама ўскалыхнуць абаронную работу сярод пісьменніцкай грамадскасці БССР.

Чырвонаармейскія пісьменнікі і паэты: Угрумаў, Небыліца, Сліпінскі, Орлоўскі, Чалы, Грабчэнка, Остроўскі, Абразцоў, Казлоўскі і інш. маюць патрэбу ў канкрэтнай практычнай дапамозе. Не дапамагчы ім зараз — злачынства перад грамадскасцю, перад абараназдольнасцю краіны. Маладую творчую сілу неабходна беражліва вырошчваць, дапамагаць ёй моцна стаць на ногі, даць магчымасць набраць творчыя сілы.

10 лістапада Палітупраўленне БАВА склікае акруговую нараду чырвонаармейскіх пісьменнікаў і паэтаў. Нарада вызначыць шляхі і арганізацыйныя мерапрыемствы далейшага развіцця літаратурна-творчага руху ў часцях БАВА. Актыў байцоў-пісьменнікаў рыхтуецца да нарады. Апрача арганізацыйных пытанняў тут ва ўсю шырыню разгорнуцца, а гэта самае галоўнае, пытанні творчага парадку.

Праўленне ССПБ абавязана на гэтай нарадзе сказаць, у чым выразілася яго дапамога пачынаючаму і маладому чырвонаармейскаму пісьменніку, хоць-бы ў 1937—38 гг., і што яно мяркуе зрабіць у далейшым, а зрабіць яно штосьці павінна, не толькі павінна, але і абавязана, абавязана ў якойсьці пэўнай практычна-карыснай сістэме. Беларускія пісьменнікі на нарадзе павінны прыняць актыўны ўдзел — гэта іх абавязак у справе ўмацавання абароны краіны.

Чырвонаармейскаму літаратурнаму руху трэба звярнуць вялікую ўвагу.

Вл. ГЛАЗЫРЫН.



Мастак П. П. Сокалаў-Скаля да XX гадавіны ВЛКСМ закончыў карціну «Подвіг таварыша Агеева». (Саюзфото)

С. ХАДЫКА

АБ ДЗЕЦЯХ І ВАЙНЕ

За акном бушуе вецер,
Лес да долу гне.
Штосьці шэпча ў гэты вечар
Хлопчык увасне.

Дрэмле маці у куточку, —
Сны—як галубкі,—
Кніга выпала ў сыночка
Сонпага з рукі.

Бачыць ён: малыя дзеці
На лужок пайшлі.
Залатое сонца свеціць
На сады, палі.

Дзень бязвоблачны, вясенні..
Што-ж за гром ўдалі?
Смерценосных крылляў цені
На зямлю ляглі.

Кулямёт з высі затахкаў,
Распасцёрся дым.
Разляцеліся ад жаху
Дзеці—это куды.

У падушкі зарывацца
Сіл ужо няма:
Нібы шмат прыгожых цацак
Волат разламаў.

Не знайсці шпаковак белых, —
Гул—зямля дрыжыць,
Рад чарэшань абгарэлых
На зямлі ляжыць.

Птах гудзіць уверсе, зліцца.
Праз густы туман
Над дамамі грозна мчыцца,
Нібы ураган.

... Хлопчык брэдзіць, ды не плача.
Б'е яго азноб.
Маці гладзіць лоб гарачы —
Белы сынаў лоб.

— Спі, сынок, пакінь турботы,
Кніжку палажы.
Бо вартуюць самалёты
Нашы рубяжы.

Адпачні, мой сінявокі,
Любы—баю-бай.
Заўтра бегай, лазь і скокай,
Смелым вырастай.

Храбрым, дужым будзь, як тата,
І малы заціх.
Дзверы скрыпнулі—і вецер
Рынуў на двaix.

Раптам увайшоў у дзверы,
Нібы з-пад вады,
З зоркаю на шлеме шэрым
Лётчык малады.

— Разбамбілі ўсе мішэні, —
Жонцы ён шапнуў.
І двaix у змроку шэрым
К сэрцу прыгарнуў.

Пераклаў з рускай мовы
К. Ц.

ДА 130-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

А. В. КАЛЬЦОЎ

***
Л. БАРАГ
***

Руская літаратура пачатку мінулага стагоддзя ведае цэлы рад сялянскіх паэтаў-самавучак. Усе яны або загінулі ў цяжкіх жыццёвых умовах, не дасягнуўшы творчага росквіту, або вырадзіўся ў дабрадзейных эпігонаў дваранскай паэзіі, як гэта здарылася, напрыклад, з таленавітым прыгоннікам Яраслаўскай губерні Фёдарам Слепушкіным. Незадоўга да пачатку літаратурнай дзейнасці Кальцова гэты Слепушкін выдаў збор вершаў, які быў удастоен залатой медалі Акадэміі навук і асабістай пахвалы яе прэзідэнта—праславутага адмірала Шышкова за «нарядный вкус, благонравие, благородный слог и чистый язык, сельским описаниям приличный».

Здавалася, усе ўмовы штурхалі на такі шлях і сына дробнага варонежскага гандляра жывёлай — Аляксея Кальцова. Аднак гэтага з ім не здарылася, і ён знайшоў сваё ўласнае месца ў літаратуры, стаўшы стваральнікам «цудоўных, кроўна-родных песень» (Герцэн), стаўшы «вялікім народным паэтам» (Добралюбаў).

Выхаваны непасрэднай блізкасцю да рускай прыроды і працоўнага народа, Кальцоў амаль усё сваё жыццё імкнуўся парваць сувязь з мяшчанскім светам свайго бацькі. «Бацька чалавек капеечны, алтыннік, — пісаў Кальцоў Белінскаму, — куй яму грошы — слаўны сын, падлічай — добры чалавек». Новы светлы і радасны свет адкрыла Кальцову знаёмства з рэвалюцыйным дэмакратам Белінскім у адзін з прыездаў паэта ў Пецербург па справах бацькі. У пісьме да Белінскага ён пазней сам прызнаваўся: «Вы ў сваім гуртку перарадзілі мяне. Дыхаю вольна, жыву шырока і такая паўната авалодае мною, якой ніколі не адчуваў». Да сваіх пецярбургскіх сяброў—Белінскага, Станкевіча, Пушкіна — Кальцоў рваўся з апрыкрага бацькоўскага дома, падобна паказаным у яго песнях удальцам, якім нехапае крылляў: «Так і рвешся да вас душою, мілыя мае, ды крылляў няма»,—скардзіўся ён у другім пісьме да Белінскага з Варонежа.

Парываючы сувязі з мяшчанскім асяроддзем, Кальцоў пад уплывам Белінскага паступова адыходзіў ад мяшчанскіх матываў і псеўданародных вобразаў, уласцівых многім з яго ран-



ніх вершаў. Вельмі спрыяў набліжэнню Кальцова да сапраўднай народнасці і добратворны ўплыў пушкінскай паэзіі. Кальцоў ужо часоў сваіх апошніх сустрэч з Белінскім (1840—41 гг.) падыходзіў шчыльна да таго, каб стаць ідэйным саюзнікам лепшых, перадавых людзей сваёй эпохі. Аднак, у росквіце сваіх творчых сіл Кальцову суджана было пасці ахвярай абкружаўшага яго кулацка-мяшчанскага асяроддзя. 29 кастрычніка 1842 года ён памёр ад сухот, надломлены сямейнымі звадкамі і частымі сваркамі з бацькам. Атрымаўшы паведамленне аб смерці Кальцова, Белінскі напісаў Боткіну: «Паў друг, брат, нічога, з богам, справа звычайная».

Кальцоў знайшоў сябе, стаўшы паэтам сялянскай працы. З глыбокім пачуццём любві і радасці апявае Кальцоў касьбу, ворыва, збор ураджаю і іншыя будні сялянскага жыцця. Ен знайшоў сапраўдную паэзію там, дзе яе раней не бачылі іншыя паэты: у калоссях жыта, якія «спеют и рядятся в золотые ткани», у скіртах хлеба, што «как князья, широко сидят, подняв головы». Гэта было рашучым ударам па тагочаснай традыцыйнай рамантычнай паэзіі. Самыя звычайныя касары і жнеі, захопленыя радаснай працай і сумуючыя па каханню і волі, зрабіліся ўлюбёнымі героямі Кальцова. «Ніхто, не выключаючы і самога Пушкіна—адзначаў Глеб Успенскі—не кранаў такіх паэтычных струн народнай душы, народнага светаадчування, выхаванага выключна на ўмовах земляробскай працы, як гэта мы знаходзім у паэта-прасола» (Кальцова—**Л. Б.**).

У паэзіі Кальцова было выражана новае, працоўнае ўспрыйманне прыроды, чуждае сучаснай яму дваранскай паэзіі. Вобразы прыроды зліваюцца ў вершах Кальцова з паказам чалавечай працы:

Ах ты, степь моя,
Степь привольная,
Широко ты, степь
Пораскинулась;
К морю черному
Понадвинулась.
В гости я к тебе
Не один пришел:
Я пришел сам друг
С косой острою;
Мне давно гулять
По траве степной,
Вдоль и поперек
С ней хотелося.
Раззудись, плечо,
Размахнись рука... («Касар»).

Паэт не з'яўляецца тут пасіўным назіральнікам прыроды, але ўспрымае яе ў сувязі з чалавекам—гаспадаром гэтай прыроды. Не чалавек для прыроды, а прырода для чалавека—гэтая думка праходзіць праз усю творчасць Кальцова. У сувязі з гэтым знаходзіцца насычанасць кальцоўскага пейзажа лірызмам. Карціны прыроды ў вершах Кальцова прасякнуты тым настроем, які перажывае герой. Асабліва добра і тонка зроблены ў гэтых адносінах такія песні, як «Дуют ветры, ветры буйные», «Греет солнышко, да осенью».

Пачуцці і настроі герояў Кальцова—гэта пачуцці і настроі людзей працы, людзей, якія стаяць блізка да прыроды. Асноўны тон яго лірыкі—бадзёры, мажорны тон. Так, напрыклад, любоў у Кальцова заўсёды пачуццё, абуджаючае сілы чалавека. Аб адным з сваіх герояў паэт гаворыць:

Что ему дорога!
Тучи громовые!
Когда придут по сердцу —
Очи голубые. («У полі вецер вее»).

Такія вершы Кальцова, як «Кальцо», «Разлука», «Пара кахання», цяжка параўнаць з якімі-небудзь іншымі творамі рускай паэзіі па сіле выказанага ў іх пачуцця тугі сялянскай дзяўчыны па каханаму. Для выказвання гэтага моцнага пачуцця Кальцоў знаходзіць выключна своеасаблівыя вобразы:

Стоит она, задумалась,
Дыханьем чар овеяна:
Запала в грудь любовь-тоска,
Нейдет с души тяжелый вздох:
Грудь белая волнуется,
Что реченька глубокая —
Песку со дна не выкинешь;
В лице огонь,—в глазах туман,
Смеркает степь, горит заря.
(«Пара кахання»).

Недарма малады Чэрнышэўскі, абраўшы для падарунка сваёй нявесце кнігу песень Кальцова, запісаў у сваім дзённіку: «Кніга кахання, чыстага як маё каханне». Кніга, у якой каханне сапраўднай сілы і бадзёрасці, як маё каханне да яе, няхай будзе сімвалам майго кахання да яе».

Кальцоў паказвае працу і быт селяніна ў адрыве ад соцыяльнага жыцця і не паказвае прыгонніцкага гнёту. Аднак, гэта сведчыць толькі аб палітычнай няспеласці паэта, абумоўленай часткова гістарычнымі ўмовамі, але не гаворыць аб антынароднасці Кальцова, як гэта спрабавалі даказаць некаторыя навейшыя крытыкі. Карціны працы ў Кальцова прасякнуты гарачым спачуваннем працоўнаму селяніну і ў асаблівасці — гаротнаму бедняку, і калі гэтыя карціны надта ідылічныя, то ўзбуджаюць зусім не сентыментальнае, маніла ўскае пачуццё, але пачуццё бадзёрасці і быццам супроцьстаяць прыгонніцкаму застою. У кальцоўскіх удальцах шмат стыхійнага і неасвядомленага. Герой песні «Удалец», імкнучыся «вольнай воляй жыць», спрабуе нават знайсці выхад сваім бурным імкненням у царскай службе. Але вобразы такіх стыхійных молодцаў адлюстроўвалі абуджэнне сіл народа і смутнае ўсведамленне немагчымасці жыць па-старому:

Так и рвется душа
Из груди молодой,
Хочет воли она,
Жаждет жизни другой!

Магутны і радасны парыў да волі, да барацьбы з сіламі, скоўваючымі свабоду чалавека, асабліва ярка выражаны ў апошніх вершах Кальцова «Пуць», «Дума сокала», «Целы дзень на небе», «Перапуцце», «Сценька Разін». Па повяду песні Кальцова «Сценька Разін» Салтыкоў-Шчэдрын трапна заўважыў: «Палкае пачуццё асобы разрывае ўсе знадворныя перашкоды і, быццам вышаўшая з берагоў рака, затапляе, разбурае і нясе з сабою ўсё, што сустракаецца на шляху».

У некаторых вершах Кальцова гучаць матывы соцыяльнага пратэсту. Гэта датычыць перш за ўсё да вядомага верша «Лес», які па сіле выказанай у ім тугі і абурэння, выкліканага смерцю Пушкіна, стаіць ледзьве не побач з вершам Лермантава «На смерць паэта». Сцвярджэнне смелай і рашучай барацьбы з акалічнасцямі дана ў вершах Кальцова «К таварышу», «Апошняя барацьба», «Пасланне к Белінскаму». Калі сярод ранніх вершаў Кальцова можна знайсці такі «вернападданіцкі» верш, як «Ура», то нічога падобнага няма сярод зусім спелых яго твораў. Затое сярод вершаў Кальцова апошняга перыяду знаходзяцца такія песні, як «У Александраўскай слабодзе», дзе рысуецца самымі змрочнымі фарбамі злавесны вобраз рускага самадзяржаўца. У апошнія годы свайго жыцця Кальцоў парывае з рэлігійнымі поглядамі, якім не быў варожы ў ранняй творчасці. Гэта відаць, напрыклад, з верша «З Гарацыя» (1841)—аднаго з лепшых твораў Кальцова.

Паэзія Кальцова цесна звязана з вуснай паэзіяй народа. Аднак ні адзін з вершаў Кальцова не з'яўляецца перапрацоўкай якой-небудзь адной народнай песні. Матывы народнай паэзіі Кальцоў арганічна зліваў з вобразамі, ідучымі ад кніжнай паэзіі. Ім былі развіты такія фальклорныя матывы, як смутак па згубленай маладосці, барацьба з лёсам, скаргі на горкую долю і інш. Асабліва цудоўна і своеасабліва выкарыстаў ён сімвалічныя вобразы фальклора ў песнях «Лес» і «Другая песня Ліхача Кудравіча». Глыбока няправыя тыя крытыкі, якія, не знаходзячы ў Кальцова некаторых вобразаў, характэрных для вуснай паэзіі, сцвярджаюць, быццам паэзія Кальцова варожа фальклору. Паэзія Кальцова блізка рускаму фальклору па свайму духу, а не асобнымі стылістычнымі супадзеннямі з народнымі песнямі.

З рускімі народнымі песнямі роднiць песні Кальцова іх напеўнасць, музыкальнасць. Сам Кальцоў быў выдатнай музыкальнай натурай, і музыка аказвала ўплыў на яго творчасць. Так пад уплывам музыкі, чутай ім аднойчы на вечары ў Боткіна, ён пісаў:

Сколько звуков, сколько песен
Разлалося вновь во мне!
Сколько образов чудесных
Оживилось в вышине» («Свет музыкі»).

Не выпадкова таму, што песні Кальцова паслужылі матэрыялам для цэлага мноства твораў рускай класічнай музыкі. Песні Кальцова ўзнаўлялі Рымскі-Корсакаў, Глінка, Мусоргскі, Рахманінаў, Даргамыжскі, Рубінштэйн, Кюі, Грэчанінаў, Дзюбок, Глазуноў і інш. Такія песні Кальцова, як «Салавей», «Раздумье селяніна», «Цэлы дзень на небе», «Так і рвецца душа», «Не скажу нікаму», «Не весна тады», узнаўляліся ў музыцы 10—12 разоў кожная.

Традыцыі паэзіі Кальцова былі выкарыстаны паэтамі-дэмакратамі 60-х гадоў. У адным з сваіх артыкулаў Добралюбаў пісаў: «Нам патрэбен быў-бы цяпер паэт, які з прыгажосцю Пушкіна і сілаю Лермантава ўмеў прадаўжаць і рэальны, здаровы бок вершаў Кальцова». Такімі паэтамі з'явіліся часткова Некрасаў і Шаўчэнка.

ВУЧЭБНЫ ГОД У КАНСЕРВАТОРЫІ



Група выдатнікаў вучобы фартэп'яннага музыкальна-педагагічнага і кампазітарскага факультэтаў Белдзяржкансерваторыі. НА ЗДЫМКУ: (злева направа) Алоўнікаў В. В., Чорная І. М., Загорская І. М., Тамаркіна С. І., Гордзіна Р. В., Валадзькоў Е. П. Фота Каплінскага.

* * *

У бягучым вучэбным годзе Беларуская Дзяржаўная кансерваторыя ўступіла ў сёмы год свайго існавання. Кансерваторыя дала рэспубліцы рад выдатных выпускнікоў, якія працуюць у Тэатры оперы і балета, у музыкальных вучылішчах, у кансерваторыі і ў іншых арганізацыях БССР. Выпускнікі двух мінулых год: дэпутат Вярхоўнага Совета БССР кампазітар Багатыроў, кампазітары Падкавыраў і Крошнер, спявак Сімаго, піяністка Рапапорт і інш.

Аднак цяжка гаварыць аб спрыяючых

* * *



Дацэнт Белдзяржкансерваторыі Штэйман М. на занятках са студэнтам II курса Пронiным М. І. па класу трубы.

* * *

умовах работы Кансерваторыі ў мінулыя годы, шкодніцкая дзейнасць ворагаў народа як у самой Кансерваторыі, так і ва Упраўленні па справах мастацтваў зрывала навучальны працэс.

Мінулы год з'явіўся пераломным у рабоце Кансерваторыі. Запрашэнне раду буйных маладых спецыялістаў, у большасці аспірантаў Маскоўскай Кансерваторыі і лаўрэатаў усесаюзных конкурсаў (дацэнты Амітон, Клумаў, Грынберг, Зінчук і інш.), дазволіла ўвесці новыя, перадавыя метады выкладання, узбагачаныя дасягненнямі савецкай музыкальнай навукі. Ужо ў мінулым вучэбным годзе, у рэзультаце веснавой экзаменацыйнай сесіі, Кансерваторыя мела больш дзесяці студэнтаў, выдатна паспяваючых па ўсіх дысцыплінах вучэбнага плана, і вышла на агульную сярэднюю ацэнку вышэй добрай. У канцы мінулага вучэбнага года ўпершыню быў праведзен для заканчваючых дзяржаўны экзамен камісіяй пад старшынствам доктара музыкальных навук праф. Маскоўскай Кансерваторыі Г. М. Когана. Па водзыву праф. Когана, дзяржаўныя экзамены паказалі значныя поспехі ў рабоце маладой Кансерваторыі. З васьмі студэнтаў, здаўшых іспыты, чацвёра атрымалі дыпломы першай ступені.

У новым прыёме гэтага года кантынгент вучняў даведзен да 160 чалавек, што ў сувязі з адсевам прафесіянальна непрыгодных студэнтаў стварыла здаровы і працаздольны студэнцкі калектыў.

Вялікае месца ў новым наборы занялі будучыя педагагічныя кадры, у якіх мае вялікую патрэбу наша рэспубліка. Упершыню атрымалі значнае папаўненне такія факультэты, як музыкальна-педагагічны і гісторыка-тэарэтычны. Умацаваны класы харавой работы, аркестра і оперны клас. Новазапрошаныя кіраўнікі дапамогуць Кансерваторыі падрыхтаваць на гэтых участках поўнацэнныя мастацкія кадры. Новыя вучэбныя планы Кансерваторыі прадугледжваюць фарміраванне ўсебакова развітых савецкіх музыкантаў. Вялікую ролю адыгрывае ўвядзенне, згодна гэтых планаў, рускай мовы і літаратуры і ўмацаванне значэння кафедры сацыяльна-эканамічных навук, якая непасрэдна садзейнічае ідэйна-палітычнаму выхаванню студэнцтва. Вялікае значэнне ў далейшым павышэнні паспяховасці і дысцыпліны мае міжфакультэтнае

сацыялістычнае спаборніцтва, якое ахоплівае ўсіх студэнтаў.

Бягучы вучэбны год павінен з'явіцца годам пачатку паглыбленай навуковай работы кафедраў Кансерваторыі. Велізарны абавязак накладае на Кансерваторыю ўвядзенне штатнаакладнай сістэмы, якая чотка вызначае кола дзейнасці кафедры і яе членаў. Нязмерна ўзрастае значэнне кожнай кафедры, як асноўнай навуковай арганізацыі, вядучай, апрача педагагічнай, глыбокую даследчую работу. Планы навуковай работы кафедраў шырокія і разнастайныя. У іх уваходзяць, побач з агульнамузыкальнымі, метадычнымі і музыкальна-гістарычнымі тэмамі, таксама тэмы, распрацоўваючыя праблемы нацыянальных музыкальных культур, у прыватнасці — беларускай. К канцу вучэбнага года Кансерваторыя мяркуе выдаць некалькі зборнікаў навуковых работ кафедраў. Арганізацыя асобных кабінетаў для вядучых кафедраў дазволіць упарадкаваць і сістэматызаваць іх работу.

Намечан да арганізацыі ў бягучым вучэбным годзе музыкальна-этнаграфічны кабінет, у якім будзе сканцэнтраваны музыкальны фальклорны матэрыял, што ёсць у радзе арганізацый. Арганізацыя такога кабінета дасць магчымасць паглыблена працаваць над беларускай народнай музыкальнай культурай.

Рад недахопаў перашкаджае рабоце Кансерваторыі. Цесната памяшкання, у якім займаюцца тры навучальныя ўстановы (Кансерваторыя, музычнае вучылішча і вячэрнія музкурсы), перашкаджае нармальнаму ходу вучэбнага працэса. У маленькіх класах займаюцца групы па 15—20 чалавек, класных пакояў нехапае, няма пакоя адпачынку для педагогаў, чытальні для студэнтаў. Дрэнна абстаіць справа і з інтэрнатам для студэнтаў. У радзе выпадкаў у пакоях жыве па 10—15 чалавек. Самастойная работа ў такой абстаноўцы надзвычай затрудняецца. Не ўсе педагогі забяспечаны жыллёвымі

* * *



Дацэнт Белдзяржкансерваторыі Арлоў М. З. праводзіць заняткі са студэнткай II курса Быхаўскай Ф. Е. па класу віяланчэлі.

* * *

ўмовамі. Новае кіраўніцтва Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР павінна ўважліва заняцца гэтымі пытаннямі і зрабіць усё магчымае, каб знішчыць недахопы, перашкаджаючыя нармальнай рабоце вышэйшай музыкальнай навучальнай установы БССР.

***

Вучэбны дзень у Кансерваторыі разнастайны і цікавы. З 7 гадзін раніцы адкрываецца вучэбны корпус. Гэта час самастойнай работы студэнтаў. Да 9 гадзін раніцы ўсе класы і інструменты — да паслуг навучаючыхся. З 9 гадзін пачынаюцца акадэмічныя заняткі. Упарта і настойліва авалодвае складаным музыкальным мастацтвам наша савецкая моладзь. У гэтай упартай вучобе — залог яе будучых поспехаў. Савецкая музыкальная культура стала самай перадавой у свеце культурай і далейшы шлях яе развіцця шырокі і бязмежны.

К. АЛАУ.

Анастася КАЛЕСНІКАВА

КАЛЫХАНКА

Спі, мой сінявокі,
Не пазнаеш гора.
Шлях твой — радасць, шчасце,
Шлях твой — кветак мора.
Для цябе, мой любы,
Дзетсады, пляцоўкі,
Школы, інтэрнаты,
У жыццё пуцёўкі.
Для цябе, мой любы,
Кнігі і газеты,
Для цябе адкрыты
Універсітэты.
Вырастай, сыночак,
На радасць і славу,
І бярыся смела
За любую справу.
Хочаш інжынерам —
Будзеш рушыць горы;
Можа капітанам
Будзеш плаваць ў моры.
Альбо лёгкакрылай
Птушкай ў далі сіняй
З бураю спрачацца,
Кіраваць машынай.
Можа ты музыкам
Быць захочаш, сыне,
Песні пець з задорам
Пра сваю краіну?
Памятай, мой любы,
Што нідзе на свеце
Радасна-шчасліва
Не жывуць так дзеці.

ШЭФСТВА НАД МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦЮ

«Краіна Саюза Сацыялістычных Советаў здзіўляюча ўраджайна на таленавітых людзей, таму што ўсім людзям працы дана свабода развіцця іх талентаў». — гэтыя словы вялікага Горкага міжвольна прыходзяць на памяць, калі глядзіш ці слухаеш выступленні ўдзельнікаў самадзейнага мастацтва.

У нашай краіне квітнее народная творчасць, быстра расце мастацкая самадзейнасць.

Лепшым доказам гэтага з'явіўся агульнамаскоўскі агляд народнай творчасці, у якім прыняло ўдзел 58.000 выканаўцаў.

Трэба ўсямерна берагчы і вырошчваць кожнага здольнага, адоранага чалавека, трэба дапамагаць развіваць яго творчыя здольнасці.

Мы звяртаемся да майстроў мастацтваў усіх жанраў з просьбаю ўзяць асабістае шэфства над асобнымі калектывамі і салістамі — удзельнікамі мастацкай самадзейнасці.

Гэта шэфства не павінна ператварыцца ў «чарговую кампанію», у «ўрачыстыя пасяджэнні», «пышныя фразы».

Мастацкая самадзейнасць мае патрэбу ў сталым бацькоўскім клопаце. Формы дапамогі могуць быць розныя: наведванне рэпетыцый, гутаркі з калектывам, кансультацыі, індывідуальныя заняткі, прагляд і крытыка тэатральных і канцэртных выступленняў і т. д.

Дапамога павінна быць канкрэтнай, таварыскай, дзелавой.

Кожны з нас абавязваецца ўзяць шэфства над адным з калектываў мастацкай самадзейнасці гор. Масквы.

Арганізацыю і кіраўніцтва гэтай работай павінны ўзяць на сябе саюз работнікаў мастацтваў і маскоўскі Дом мастацкай самадзейнасці пры актыўным удзеле Усерасійскага тэатральнага таварыства.

Возьмемся за гэту справу з такой-жа адданасцю і любоўю, з якой мы служым нашаму роднаму мастацтву, мастацтву, выпеставанаму партыяй Леніна—Сталіна.

Дарагія таварышы майстры мастацтва, арганізуем спаборніцтва па аказанню дапамогі мастацкай самадзейнасці.

Дэпутат Вярхоўнага Совета СССР— ордэнаносец, народны артыст СССР І. М. МАСКВІН.

Дэпутат Вярхоўнага Совета РСФСР ордэнаносец, народная артыстка СССР В. В. БАРСАВА.

(«Правда» ад 9/X—1938 г.).

РАШЭННЕ ПРЭЗІДЫУМА ЦК РАБОТНІКАЎ МАСТАЦТВАЎ

На ўчорашнім пасяджэнні прэзідыума ЦК работнікаў мастацтваў быў абмяркован надрукаваны ў «Правде» 9 кастрычніка зварот дэпутата Вярхоўнага Совета СССР народнага артыста СССР І. М. Масквіна і дэпутата Вярхоўнага Совета РСФСР народнай артысткі СССР В. В. Барсавай да майстроў мастацтваў аб шэфстве над мастацкай самадзейнасцю.

Прэзідыум ЦК работнікаў мастацтваў лічыць, што зварот народных артыстаў ставіць перад майстрамі савецкага мастацтва пачэсную, палітычнай важнасці задачу — берагчы, вырошчваць і вылучаць творча здольных, адораных людзей. Прэзідыум звяртаецца да ўсіх работнікаў мастацтваў Саюза ССР з заклікам арганізаваць сацыялістычнае спаборніцтва на лепшую дапамогу калектывам мастацкай самадзейнасці і асобным салістам.

ЦК работнікаў мастацтваў абавязвае рэспубліканскія, краявыя і абласныя камітэты саюза неадкладна абмеркаваць на агульных сходах работнікаў мастацка-відовішчных прадпрыемстваў і вучачыхся мастацкіх навучальных устаноў зварот І. М. Масквіна і В. В. Барсавай і ўзначаліць спаборніцтва майстроў мастацтваў у адказ на гэты зварот.

СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА НА ЛЕПШУЮ ДАПАМОГУ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

Прэзідыум Беларускага Рэспубліканскага Камітэта саюза работнікаў мастацтваў на пасяджэнні ад 13 кастрычніка, абмеркаваўшы зварот народных артыстаў СССР—дэпутата Вярхоўнага Совета СССР ордэнаносца тав. І. М. Масквіна і дэпутата Вярхоўнага Совета РСФСР ордэнаносца В. В. Барсавай, апублікаваны ў газеце «Правда» 9 кастрычніка 1938 года аб шэфстве майстроў мастацтваў над калектывамі мастацкай самадзейнасці,—прапанаваў усім сваім мясцкомам паставіць гэты зварот на абмеркаванне агульных сходаў і разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва на лепшае шэфства над калектывамі мастацкай самадзейнасці.

У сувязі з тым, што па БССР праводзіцца падрыхтоўка да ІІІ-й Усебеларускай алімпіяды мастацкай самадзейнасці, прэзідыум БРК саюза работнікаў мастацтваў вырашыў склікаць шырокую нараду профактыва для абмеркавання звароту тт. Масквіна і Барсавай і заслухання інфармацый з месц аб шэфстве над калектывамі самадзейнасці.

Прэзідыум БРК саюза звярнуўся з заклікам да ўсіх работнікаў мастацтваў аказаць канкрэтную дапамогу калектывам мастацкай самадзейнасці.

УЗОРНЫ САМАДЗЕЙНЫ АРКЕСТР

Заслона раскрылася. На сцэне цудоўнае відовішча. Каля сотні чырвонаармейцаў у форме. Сярод іх—камандзіры, малодшыя камандзіры, баявыя камандзірскія падругі. Аркестр размешчаны на спецыяльнай канструкцыі, а таму ён на сцэне ўзвышаецца пірамідападобна. Домры, гітары, балалайкі, скрыпкі, трубы, трамбоны, валторны; мужчынскі харавы ансамбль, жаночы хор, танцавальная група. Дырыжор і кіраўнік калектыва тэхнік інтэндант 1 ранга тав. Нахшын; грудзь яго скромна ўпрыгожвае медаль «XX год РСЧА». Ён доўга працаваў над складваннем калектыва упартая праца ўвенчана цудоўнымі рэзультатамі.

З труб вырываюцца першыя гукі, гукі трывогі. Трывога пераходзіць у мелодыю песні бр. Пакрас «Если завтра война», тэму падхватваюць валторны, гераічным заклікам гудзіць у нізкіх нотах трамбон. Запявае малодшы камандзір Кулікаў. У прыпеў ўступае ўвесь складаны ансамбль. Злажана выконвае калектыў песню ад пачатку да канца. Харавы твор савецкага кампазітара выдатна распрацаваны ў разнастайнейшых музыкальных фарбах. Выкананне выклікае ў слухача глыбокае ўражанне, стварае ўздым.

Хор-аркестр выконвае доўгую праграму, цэлае канцэртнае аддзяленне. І ў слухача не губляецца цікавасць, з кожнай новай рэччу гучней і гучней апладысменты.

Выконваецца мантаж песняў і мелодый, зведзены ў кампазіцыю «Пагранічная комсамольская», песня аб слаўных гераічных пагранічніках-комсамольцах Далёкага Усхода, ахоўваючых сваю родную краіну ад нападу агалцелых самураяў. Гэтая песня — музыка аб героіцы маладых байцоў.

Адна за другой выконваюцца цудоўныя савецкія песні аб гераічнай Чырвонай Арміі: «Казачая церская»—Пакраса, «Не скасіць нас шабляй вострай», «Песня аб «Тачанцы»—Лістова, «Артылерыйская» — бр. Пакрас і шмат іншых. Ва ўсе песні ўкладзена душа адданага радзіме байца і майстэрства выдатнага самадзейнага калектыва. Салісты аркестра тт. Далонаў, Роффе Мядзведзева, Остраухава, Бізер, Барысаў, Кашын, Марынчык упрыгожваюць песні сваёй задушэўнасцю і мастацкім словам.

Палілася мелодыя народнай украінскай песні «Кіну кужаль на паліцу». У песні — задор, весялосць, ліхая пляска—ног не стрымаць.

Так працуе калектыў Н-скай часці, ствараючы выдатны рэпертуар савецкай баявой песні ў дружным ансамблі музыкі, песні і танца.

Ваенны Совет БАВА за паказ узораў выдатнай чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці, за баявую тэматыку рэпертуара ўзнагародзіў калектыў, кіруемы тав. Нахшыным, преміяй у 25.000 руб.

Калектыў расце і мацнее, прыцягваючы лепшых спевакоў і музыкантаў часці, узбагачае свой рэпертуар, павышае мастацкія патрабаванні да сябе і становіцца сапраўдным узорам высокага самадзейнага чырвонаармейскага мастацтва, мастацтва сапраўднага, баявога, выхоўваючага масы.

Вл. МУРАТ.

ВЫСТАЎКА РАБОТ МАСТАКА Н. Л. ТАРАСІКАВА

13 кастрычніка ў Доме мастака адкрыта індывідуальная выстаўка жывапісу і рысунка маладога мастака Нікалая Лукіча Тарасікава. Выстаўлена 100 работ, у тым ліку рад эскізаў аб чырвоным казацтве, аб жыцці рыбакоў Чорнага мора, беларускія пейзажы, партрэты і інш.

18 кастрычніка ў Доме мастака адбудзецца вечар, прысвечаны абмеркаванню творчасці Н. Л. Тарасікава.

„СЯБРЫ“



Кадр з кінофільма «Сябры». Фото Каплінскага.

* * *

НОВЫ ФІЛЬМ ВЫТВОРЧАСЦІ „ЛЕНФІЛЬМА“

На экране—мастацкі фільм «Сябры». Гэта фільм аб вялікай дружбе народаў,—аб брацтве народаў, заваяваным у баях Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, замацаваным сумеснай барацьбой і перамогай працоўных.

Гэта фільм аб людзях гор — народнасцях Каўказа. Расказаць аб тым, «як жылося гэтым людзям да Кастрычніка, як яны аддана і гераічна змагаліся за савецкую ўладу, як яны пакончылі з цемрай, невуцтвам, прыгнечаннем, як яны сталі «мюрыдамі Кастрычніка, свядомымі змагарамі за сацыялізм» — так акрэслілі сваю задачу аўтары фільма сцэнарысты Леў Арнштам і Нікалай Ціханаў.

Барацьба народаў гор за савецкую ўладу непарыўна звязана з імем Сяргея Міронавіча Кірава. І светлай памяці мужнага сына партыі Леніна—Сталіна, арганізатара і кіраўніка працоўных мас, бальшавіка-трыбуна — С. М. Кірава прысвечан фільм.

Таварыш Кіраў арганізаваў і ўзначаліў барацьбу народаў Каўказа супроць царскіх сатрапаў, супроць подлых здраднікаў — меншавікоў, супроць інтэрвентаў. Імя яго—імя любімага друга і кіраўніка, жыве сагрэтае любоўю ў сэрцы інгуша і асеціна, грузіна і кабардзінца — народаў гор.

«І калі артыст, які іграў бальшавіка Аляксея, паехаў у аул Эрзі, суправаджаемы коннікамі часоў грамадзянскай вайны, горцы пазналі друга ў гэтым загрыміраваным артысту і пачалі, як тады, крычаць «Кіра, добры дзень! Кіра прышоў!» — расказваюць аўтары фільма.

Аляксей — цэнтральны вобраз фільма. Шчыры і просты чалавек, мужны баец рэвалюцыі, валявы арганізатар мас, бальшавік-трыбун, Аляксей — яркі вобраз, захапляючы гледача. І народны артыст РСФСР Б. Бабачкін у ролі Аляксея паказаў свой творчы рост як мастака і як артыста кіно. З вялікай цеплынёй і непасрэднасцю артыст стварыў гэты вобраз бальшавіка, у якім глядач пазнае любімыя рысы таго, каму прысвечан фільм.

Удача ў распрацоўцы гэтага вобраза сведчыць аб тым, што савецкая кінематаграфія мае ўсе магчымасці і павінна стварыць выдатны мастацкі твор, у якім з вялікай паўнатой, яркасцю і сілай паказаць сапраўдны вобраз Сяргея Міронавіча Кірава.

Праз увесь фільм праходзяць два цікавыя персанажы беднякоў-сялян асеціна Бэты і інгуша Мусы. Былі суседзямі яны і ворагамі адзін другому. Царскія каланізатары распальвалі нацыянальную варожасць і нянавісць.

Бальшавіцкая партыя вуснамі Аляксея паказала асеціну і інгушу правільны шлях — шлях дружбы і сумеснай барацьбы з прыгнятальнікамі. І яны сталі байцамі рэвалюцыі і сынамі партыі, яны сталі сябрамі.

Бэта і Муса — збіральныя тыповыя вобразы.

Вядомы ў нашай кінематаграфіі заслужаны арт. Н. Чэркасаў у ролі асеціна Бэты пераканаўча паказаў шлях бедняка-селяніна ад несвядомасці, паднявольнага жыцця да ўсведамлення задач барацьбы, да актыўнага ўдзелу ў барацьбе за савецкую ўладу, за шчаслівую будучыню ў братняй сям'і народаў.

Запамінаецца і інгуш Муса ў выкананні артыста С. Каюкова. Уменне раскрыць і выразна акрэсліць на экране вобраз характарызуе ігру заслуж. арт. Бірман (маці Мусы), артыста Даўшвілі (кіраўнік атрада партызан Умар). Удумлівая праца над вобразамі — заслуга ўсяго акторскага калектыва фільма.

Удала распрацаваны рэжысёрам Л. Арнштамам масавыя сцэны — эпізоды барацьбы горцаў з прыгнятальнікамі і захопнікамі — з белымі палячышчамі.

Чырвоная Армія з дапамогай атрадаў народнасцей гор разграміла белыя банды, ачысціла горы Каўказа ад наймітаў і інтэрвентаў. У баі загінуў Муса. І асецін Бэта з сыноўняй ласкай прышоў суцяшаць старую маці інгуша... Партыя Леніна — Сталіна адкрыла народам гор сонечны шлях да шчаслівага жыцця.

Хвалюе і радуе гледача расказаная мовай экрана старонка гераічнай барацьбы народнасцей Каўказа за савецкую ўладу, за будучыню, квітнеючыя сённяшнія дні сацыялізма.

Р. Ю.

Да юбілею М. Ю. Лермантава

14 кастрычніка 1939 года мінае 125 год з дня нараджэння вялікага рускага пісьменніка Міхаіла Юр'евіча Лермантава.

Савецкая грамадскасць рыхтуецца да юбілею гэтага выдатнага чалавека, зацкаванага жандарам Расіі Нікалаем І і яго вернымі псамі і паўшага іх афярай.

13 кастрычніка ў Доме пісьменніка адбыўся сход паэтычнай секцыі ССП БССР, на якім вырашана прыступіць да работы над перакладамі твораў М. Ю. Лермантава, каб да юбілею выдаць аднатомнік яго твораў на беларускай мове.

У перакладах будуць прымаць удзел: Я. Купала, Я. Колас, П. Броўка, П. Глебка, А. Куляшоў, Э. Агняцвет, З. Бядуля і іншыя беларускія паэты.

Складзена камісія па адбору паэтычных твораў Лермантава, падлягаючых перакладу і размеркаванню іх паміж перакладчыкамі.

АБМЕРКАВАННЕ ЛІБРЭТА „БОЛЬШЭВІКІ ГРАНІЦЫ“

10 кастрычніка праўленне Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР і пісьменніцкі актыў абмеркавалі лібрэта І. Шапавалава «Бальшавікі граніцы». Тэма лібрэта—пільнасць і мужнасць слаўных пагранічнікаў, нашага народа, надзейна ахоўваючых непарушнасць граніц свяшчэннай савецкай зямлі. Падзеі, на якіх пабудаван сюжэт лібрэта, адбываюцца на заходняй граніцы ўлетку 1938 года. Паяўленне гэтага твора працінае сёння—знамянальная падзея ў нашым мастацтве. Напісанне лібрэта «Бальшавікі граніцы»—першы буйны твор у справе стварэння оперы пра пагранічную Савецкую Беларусь. Гэтую оперу з нецярплівасцю чакае наш глядач.

У абмеркаванні лібрэта прынялі ўдзел пісьменнікі Я. Купала, Маўр, Клімковіч, Куляшоў, Шарапаў, Броўка, Бядуля, Кучар, Глебка, Бярозкін, Модэль, Лынькоў і рэжысёр Рахленка.

З вялікім веданнем жыцця пагранічнікаў, праўдзіва распрацавана аўтарам тэма. Цікава пабудаваны сюжэт, які мае вялікую драматычную напружанасць. Створаны тыповыя вобразы пагранічнікаў і калгаснікаў—патрыётаў нашай радзімы.

Поруч з гэтым выступаўшыя адзначылі неабходнасць дапрацоўкі лібрэта.

Нязвязанасць заключнай карціны з асноўнай сюжэтнай лініяй адзначыў Янка Купала. З гэтай заўвагай згадзіліся і іншыя выступаўшыя.

На неабходнасць больш выразна і поўна акрэсліць вобразы калгасніцы-комсамолкі Алесі, маладога калгасніка Рыгора, пагранічнікаў і на тое, што ў лібрэта мала народных песень, хораў, арый—указалі таварышы Куляшоў, Глебка, Броўка і інш.

Выступаўшыя заўважылі аўтару і неапрацаванасць мовы—дыялогаў і песень, залішнюю публіцыстычнасць.

Лібрэта павінна вырасці ў яркі, захапляючы паэтычны твор, яно павінна быць сапраўднай асновай стварэння манументальнага сцэнічнага твора—оперы аб мужных патрыётах нашай радзімы.

Праўленне ССП БССР прапанавала драматычнай і паэтычнай секцыям саюза аказваць патрэбную дапамогу аўтару ва ўсім працэсе яго работы над лібрэта.

Абмеркаванне новых твораў, рукапісаў, праўленнем ССП БССР, пісьменніцкай грамадскасцю—надзвычай патрэбная справа, адна з асноўных задач саюза. Але каб гэта абмеркаванне дало максімум карысці аўтару, патрэбна яго сур'ёзна падрыхтоўваць. На гэта ўказаў загадчык культпрасветаддзела ЦК КП(б)Б тав. Эйдзінаў. Праўленне Саюза савецкіх пісьменнікаў павінна загадзя размнажаць рукапіс аўтара і знаёміць з ім пісьменнікаў, загадзя абвяшчаць дзень абмеркавання новага твору.

Нам. адказнага рэдактара А. Р. ВАРАШЫЛАУ.

Друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзённу. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Уп. Галоўлітбела № Г—5749.